незалежная газета

№ 30 (628) 12 жніўня 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Уласнік туркампаніі «Сакуб» апынуўся на нарах

Старонка 5



## У ВНУ пачнуць браць абы-каго

Старонка 8

**У НУМАРЫ**

**Скандальны офіс**
Шлейф скандалаў цягнецца за кіраўніком місіі АБСЕ ў Беларусі Гансам-Ёханам Шмідтам. **Старонка 3.**

**Выбар Айчыны**
Выбар між Беларуссю і Польшчай робяць сотні юнакоў і дзяўчат. **Старонка 6.**

**У Гродне пара эксперыментавала з порна**
28-гадоваму прадпрымальніку і ягонай партнёрцы пагражае 8 гадоў. **Старонка 10.**

**Унутраная Манголія ў цэнтры Еўропы**
Чыкагскія металісты назвалі свой гурт «Мінск». **Старонка 11.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Не мы, дык хоць нашы свінні

Аляксандр Лукашэнка: «З 2011 года будзем жыць, як у Еўропе». Але спачатку толькі ў свінагадоўлі і будаўніцтве.
**Старонка 6.** «Як у Еўропе» — гэта як? — **старонка 2.**





**Маршруты па Беларусі:**

## мястэчкі над азёрамі

Паставы—Камаі—Лучай.

Старонка 13.

# За паклёп у інтэрнэце будуць садзіць

**19-гадовая гамяльчанка зараз двойчы падумае, перш чым напісаць штосьці агіднае пра сваіх суперніц.**

Дзяўчына з Гомеля прызнаная вінаватай у паклёпе на былых аднакласніц. Але да крымінальнай адказнасці яе не прыцягнулі з-за сканчэння тэрміну даўнасці.

Год таму ў Генпракуратуру РБ паступіла заява жыхаркі г. Гомеля, у якой яна ўказала, што ў 2006 годзе яе былая аднакласніца на старонцы гомельскага сайта www.gomelchat.com стварыла анкету пад імёнамі «Шлюшки_Гомеля» і «шлюхиисподворотни», размясціўшы на ёй фотаздымкі трох аднакласніц, іх імёны і нумары мабільных тэлефонаў. Яна ўказала ў гэтай анкеце звесткі пра магчымасць аказання імі паслуг сэксуальнага характару. У далейшым яна неаднаразова перапісвалася з усімі, хто адгукаўся. Дзяўчатам пачалі паступаць званкі. Тады іх бацькі звярнуліся ў міліцую, якая знайшла стваральніцу анкет.

У дачыненні да абвінавачанай была заведзеная крымінальная справа паводле артыкула 188 «Паклёп». Дзяўчына прызнала факт стварэння анкеты, але вінаватай сябе не палічыла: маўляў, проста пажартавала.

У заяве таксама было ўказана, што суд Чыгуначнага раёна г. Гомеля вынес апраўдальны прысуд ў адносінах да стваральніцы анкеты, а касацыйная калегія па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда пакінула прысуд без зменаў.

Асноўным аргументам суда было тое, што інтэрнэт на момант разгляду справы ў судзе не з'яўляўся сродкам масавай інфармацыі.

Пасля ўважлівага разгляду матэрыялаў справы і дэталёвага аналізу нацыянальнага і замежнага заканадаўства Генпракуратурай РБ быў вынесены пратэст ў парадку нагляду, у якім прыведзеная аргументацыя неправамернасці судовых пастаноў.

Вярхоўны Суд РБ прызнаў пратэст Генпракуратуры і задаволіў яго, адмяніўшы прысуды суда Чыгуначнага раёна г. Гомеля і Гомельскага абласнога суда. Справа была перададзеная на новы разгляд.

У выніку рашэння суда Чыгуначнага раёна г. Гомеля 19-гадовая гамяльчанка прызнаная вінаватай ў распаўсюдзе ў сеціве інтэрнэт паклёпніцкай інфармацыі. Аднак ад крымінальнай адказнасці яна была вызваленая ў сувязі са сканчэннем тэрміну даўнасці справы.

Артыкул 188 Крымінальнага кодэкса РБ «Паклёп» прадугледжвае пакаранне да 3 гадоў пазбаўлення свабоды.

**Вольга Жарнасек**

# У Беларусі ўпершыню пройдуць «праймерыз»

**Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы вызначыліся з працэдурай вылучэння кандыдата на пасаду прэзідэнта ў выбарах–2010. Пра гэта расказвае кіраўнік рабочай групы, намеснік старшыні АГП Леў Марголін.**

**«Наша Ніва»: Як будзе адбывацца працэдура вылучэння адзінага кандыдата?**

**Леў Марголін**: Было шмат варыянтаў. Але мы спыніліся на «праймерыз», папярэднім галасаванні. Вясной наступнага года пройдуць выбары, дзе прадстаўнікі дэмакратычнага грамадства будуць выбіраць з загадзя зарэгістраваных кандыдатаў. Мы спадзяёмся, што ў такім галасаванні возьме ўдзел не менш за 100 тысяч чалавек. Бо менавіта столькі подпісаў трэба кандыдату, каб быць зарэгістраваным у ЦВК. Выбары будуць праходзіць у офісах дэмакратычных партый і рухаў. Не ведаю, ці ўдасца правесці «праймерыз» ва ўсіх раённых цэнтрах, але Мінск, абласныя цэнтры і гарады-стотысячнікі абавязкова накрыем.

**«НН»: А ці не позна будзе вызначаць кандыдата аж у красавіку?**

**ЛМ:** Не думаю. Выбары калі і будуць налета, то не раней за снежань. Тым не менш, імаверныя кандыдаты будуць весці агітацыйную працу ад кастрычніка да красавіка. Не павінны спазніцца.

**«НН»: А якія крытэры мусіць мець кандыдат?**

**ЛМ:** Найперш гэта ўсе тыя патрабаванні, якія запісаныя ў заканадаўстве. Плюс да ўсяго мы дадалі валоданне абедзвюма дзяржаўнымі мовамі. Кандыдат таксама мусіць унесці ў выбарчы фонд нейкую суму. Пакуль яшчэ не вызначыліся з ёй канчаткова, але гэта будзе ў раёне 5—6 тысяч даляраў. Па прапанове «Еўрапейскай кааліцыі» была ўнесеная прапанова, што кандыдат мусіць быць гатовы адстойваць сваю перамогу з рызыкай для ўласнага жыцця.

**«НН»: Якія дэмакратычныя суб'екты ўдзельнічаюць у працэдуры вылучэння адзінага?**

**ЛМ:** Найперш гэта партыі, што ўваходзяць у АДС. Таксама да нас далучыліся «Еўрапейская кааліцыя», Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Рада інтэлігенцыі.

**«НН»: А чаму не ўдалося дамовіцца з Рухам «За Свабоду»?**

**ЛМ:** Мы нікому не спрабавалі накінуць сваю волю. Зрэшты, Рух «За Свабоду» канчаткова не адрынуў нашу прапанову, калі яны захочуць да нас далучыцца, то мы будзем толькі за.



Леў Марголін.

**«НН»: Выйсці на адзінага кандыдата рэальна?**

**ЛМ:** Упэўнены, што будуць і нейкія самавылучэнцы. Але кандыдат ад аб'яднанай апазіцыі мусіць быць. Згадзіцеся, што вага кандыдата, у выбарах якога возьмуць удзел 100 тысяч чалавек, будзе нашмат большая, чым у вылучанага нейкім рухам ці фондам.

**«НН»: Некаторыя кажуць, што адзіны кандыдат непатрэбны. Важна, каб быў адзін правы кандыдат, другі — левы.**

**ЛМ:** Гэта лухта. Калі мы хочам перамагаць на выбарах, то кандыдат павінен быць адзіны.

**«НН»: А шанцы на перамогу ёсць?**

**ЛМ:** Гэта залежыць ад таго, як мы спрацуем. Скажам, ці будуць унесеныя змены ў выбарчае заканадаўства. Другім складнікам я б назваў градус напружанасці ў грамадстве. Мне здаецца, што ва ўмовах эканамічнага крызісу ён можа падвышацца.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Што значыць «жыць, як у Еўропе»?

**«З 2011 года мы будзем жыць, як у Еўропе», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка. А што значыць «жыць, як у Еўропе», запыталіся мы.**

**Мікалай Радаман, старшыня праўлення СВК «Сноў»:** Гэта значыць, падняць узровень жыцця і культуры да заходніх планак. Але па ўзроўні вытворчасці наша гаспадарка ўжо жыве, як у Еўропе.

**Аляксандр Даніленка, старшыня Мядзельскага райвыканкама:** Выкарыстанне сучасных тэхналогій, дастаткова высокі ўзровень заробкаў, стварэнне камфортных умоваў для працы і жыцця.

**Уладзімір Карагін, кіраўнік Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў:** Прыняцце еўрапейскіх каштоўнасцей, развіццё грамадзянскай супольнасці, стабільнасць заканадаўства, стымуляванне грамадскіх аб'яднанняў, развіццё дробнага бізнэсу. Адносіны да сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці як еўрапейскай.

**Ніна Стужынская, гісторык:** Значыць, змяніць статус жанчыны ў нашай краіне. Мала жанчын ва ўладзе: яны не могуць рэалізавацца.

**Віталь Сіліцкі, палітолаг:** Павінны шанавацца чалавечыя і грамадскія правы. Адукацыйная сістэма мусіць стаць часткай Балонскага працэсу. Талерантнасць да сэксменшасцяў, свабода перасоўвання, высокая культура чалавечых адносін адзін да аднаго і да працы.

**Ігар Губарэвіч, былы дыпламат, мэнэджэр:** Для мяне Еўропа — найперш свабода ў яе шматлікіх праявах. Яшчэ трапяткое стаўленне да сваіх гістарычных каранёў, мовы, традыцый.

**Ганна Герасімава, дырэктарка Беларускага дома правоў чалавека (Вільня):** Не так, як жывуць у Румыніі (смяецца). Хачу, каб была свабода і магчымасць жыць і працаваць легальна, каб дзяржава не ўмешвалася ў прыватную зону, каб правы не парушаліся і быў дабрабыт.

**Запісаў Сяргей Макарэвіч**

Працяг тэмы — старонка 7.

# Варварства пад Глыбокім

Пілуюць на дровы адзін з найлепшых пейзажных паркаў эпохі Рамантызму. Парк у вёсцы Двор Залессе быў закладзены ў XIX стагоддзі. Тут растуць (ужо раслі) дуб чырвоны, туя заходняя, хваіна Веймутава, лістоўніцы японская і найстарэйшы на Беларусі ціс ягадны...

Прыязджаю. Іду ў сельсавет. А там кажуць: «У нас ёсць праект! Вось подпісы віцебскіх архітэктараў. Усё ўзгоднена. І не трэба тут узнімаць лямант. У парку будзе аграгарадок».

Дык гэта ж помнік сядзібна-паркавага мастацтва! Ахоўваецца дзяржавай! А нашы калгасныя прарабы вырашылі – захаванню не падлягае.

Рана нам у Еўропу.

**Уладзімір Скрабатун, краязнавец, Двор Залессе — Глыбокае**


# Не ўсё ў жыцці ў апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй за ахвяраванні

Вячаславу Ш., Веры Ч., Віктару З., А.Б., Валерыю Б., М.Ш. з Брэста.

Аляксею Ш., Аляксандру К., Алесю Б., Валерыю П., Алесю Б., Валерыю П. з Баранавіцкага раёна.

А.А., А.К., Вользе П. з Магілёва.

Міхаілу Б., Аляксандру Р., Л.А. з Полацкага раёна.

В.Д., Багдану Дз., Ю.К., Аляксандру Л. з Гомеля.

В.С., В.М. з Лепельскага раёна.

Валянціне Ш., Ірыне Ц. з Жыткавіцкага раёна.

В.Л., Адзе Р. з Шаркоўшчынскага раёна.

А.Т. са Смалявіцкага раёна.

Мікалаю К., Сяргею В. з Наваполацкага раёна.

А.Р., А.Г. з Мастоўскага раёна.

С.Т. з Докшыцкага раёна.

Леакадзіі Н., Анне Р., Вікенцію С. з Валожынскага раёна.

Ю.А. з Уздзенскага раёна.

Мікалаю Б. з Глыбоцкага раёна.

# Скандальны офіс

**Шлейф скандалаў цягнеца за кіраўніком місіі АБСЕ ў Беларусі Гансам-Ёханам Шмідтам.**

Гэты дыпламат працуе ў Беларусі ад лютага 2008 года. Калі першы год да немца прыглядаліся, то цяпер не крытыкуе толькі лянівы. Дый сам Шмідт з зайздроснай перыядычнасцю трапляе ў розныя скандалы і непрыемныя сітуацыі. Пад крытыку трапляў у свой час і пасол Ганс-Георг Вік. Але скандалы з паслом Шмідтам — не толькі палітычныя, але і асабістыя.

Яшчэ ў маі кіраўнік офіса падчас сустрэчы з лідэрам АГП Анатолем Лябедзькам сказаў, што Бюро не збіраецца разглядаць прапановы апазіцыі адносна зменаў у выбарчае заканадаўства. Будуць разгледжаныя толькі прапановы ўладаў.

Бюро па дэмакратыі і правах чалавека АБСЕ настойвае на тым, каб у склад выбарчых камісій уваходзілі прадстаўнікі розных палітычных сіл, быў зроблены жорсткі кантроль за датэрміновым галасаваннем, а назіральнікі мелі права пералічваць галасы. У прынцыпе, у праекце АДС прысутнічаюць гэтыя ж прапановы, аднак мінскі офіс рашуча іх адрынуў.

Уражанае кіраўніцтва АДС звярнулася да кіраўніка АБСЕ Доры Бакаяні і дырэктара БДІПЧ АБСЕ Янэза Ленарчыча адносна выказванняў Шмідта. Гэтае пытанне разглядалася на парламенцкай сесіі АБСЕ ў Літве, што праходзіла ў канцы чэрвеня.

Абурэнне выклікала таксама нядаўняе выказванне пасла Шмідта адносна таго, што ён не лічыць праблему выканання правоў чалавека ў Беларусі прыярытэтнай для мінскага офіса. Ад гэтых словаў пасла скісла не толькі апазіцыя, але і некаторыя краіны АБСЕ. Прынамсі, ЗША. Увогуле, Штаты выступаюць за больш актыўнае развіццё адносінаў офіса з грамадзянскай супольнасцю.

Сам Шмідт у Літве рапартаваў, што задаволены працай прадстаўніцтва. Ён адзначыў, што за апошні час клімат працы офіса значна палепшаў. Тым не менш, афіцыйная беларуская дэлегацыя заявіла, што, увогуле, не бачыць сэнсу ў працягненні працы прадстаўніцтва АБСЕ ў краіне.

Не паспела скончыцца сесія, як у Мінску пачаўся новы скандал. Не быў працягнуты кантракт з кіроўцам офіса Сяргеем Гаранковым, які без нараканняў адпрацаваў на гэтым месцы дзевяць гадоў. Сяргей Гаранкоў звярнуўся са скаргай у цэнтральны офіс арганізацыі ў Вену. Стала зразумела, што ўнутры мінскага офіса таксама хапае супярэчнасцяў і разборак. У прыватнасці, яшчэ адна былая супрацоўніца звінаваціла пасла ў сэксуальных дамагальніцтвах. АБСЕ вымушаная была пачаць службовае расследаванне.

З Вены ў Мінск прыязджала адмысловая група. Ніякіх вынікаў яшчэ не абнародавана. Місія ў Мінску таксама каментароў не дае.

У адным з інтэрв'ю Сяргей Гаранкоў расказаў, што пасол Шмідт марыў стаць дарадцам Лукашэнкі, пра што неаднаразова паўтараў. Таксама ён паведаміў, што ў офісе атрымліваюць заробак два супрацоўнікі беларускага МЗС — Дзяніс Сідарэнка і Антон Шмыгаў.

Апошняя гучная справа, у якой аказаўся замешаны пасол Шмідт — гэта запрашэнне ў Мінск з экспертызай па справе зняволення Мікалая Аўтуховіча нямецкага прафесара Марціна Фінке.

Апошнім часам кантакты беларускай апазіцыі з офісам АБСЕ зведзеныя да мінімуму. На мінулым тыдні Анатоль Лябедзька быў вымушаны ехаць у Варшаву, каб сустрэцца з прадстаўнікамі АБСЕ ў справе змянення выбарчага заканадаўства. Па словах Лябедзькі, сустрэча адбылася праз тое, што атрымаць нейкую інфармацыю ў Мінску немагчыма.

«На жаль, вымушаны канстатаваць, што офіс АБСЕ перастаў быць генератарам нейкіх ідэй, ініцыятываў і прапановаў. Яго дзейнасць скукожылася да функцыі кулуарнага дарадцы беларускіх уладаў. Не больш за тое. Нейкія дробныя ініцыятывы, нейкія дробныя скандалы. І гэта ёсць выраджэнне офіса АБСЕ ў Беларусі», — заявіў Лябедзька.

Па нашых звестках, пасол Шмідт можа пакінуць сваю пасаду ўжо ў верасні. Аднак вялікае пытанне: ці застанецца офіс? Адміністрацыя Лукашэнкі напэўна хацела б давесці справу да яго ліквідацыі на той ці іншай падставе.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Пасол Шмідт (справа) аддаваў перавагу кантактам з лукашэнкаўцамі. На фота — з цяперашнім міністрам унутраных справаў Анатолем Куляшовым.**

**Мінскі офіс АБСЕ**

Да 2003 года функцыі прадстаўніцтва АБСЕ ў Мінску выконвала кансультацыйна-назіральная група. Мандат гэтай групы, якая дзейнічала ад 1998 года, меў на мэце садзейнічанне дэмакратычным інстытутам у Беларусі. З 2003 года функцыі прадстаўніцтва выконвае офіс АБСЕ. Кіраўнікамі місіі былі немцы Ганс-Георг Вік і Эберхард Хайкен, а таксама швед Оке Петэрсан.

# Юры Лявонаў: Мы не вінаватыя

Ваўкавыскі прадпрымальнік Юры Лявонаў 8 жніўня выйшаў на волю пад падпіску аб нявыездзе. Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка паранейшаму знаходзяцца за кратамі. У панядзелак Лявонаў адказаў на пытанні карэспандэнта «НН».

**«Наша Ніва»: Спадар Юры, як адбывалася вызваленне?**

**Юры Лявонаў:** У пятніцу падалі дакументы на змяненне меры стрымання. Я ведаў, што тэрмін следства канчаецца. Таму рашэнне пра вызваленне пад падпіску мяне не здзівіла. Не ведаю, чаму не вызвалілі Аўтуховіча і Асіпенку, гэта пытанне да следчых.

**«НН»: Вы праходзілі толькі па справе падпалаў дамоў?**

**ЮЛ:** Так, у тэрарызме абвінавачванні мне высунутыя не былі.

**«НН»: Наколькі актыўна праводзіліся следчыя дзеянні па справе?**

**ЮЛ:** Я не маю права разгалошваць матэрыялы справы, але магу запэўніць, што праводзіліся і допыты, і вочныя стаўкі.

**«НН»: Якія ўмовы былі ў ізалятары?**

**ЮЛ:** Знаходзіўся ў камеры, разлічанай на восем чалавек. Там увесь час было шэсць-дзевяць чалавек. Абсалютна розныя людзі. Ніякіх нараканняў у мяне няма.

**«НН»: А на здароўі як турма адбілася?**

**ЮЛ:** Не паверыце, але станоўча. Калі да турмы ў мяне была гіпертанія, ціск 180 на 140, то пасля трох месяцаў зняволення ціск стаў 120 на 80. Нават кавы магу сабе дазволіць папіць.



SVABODA.ORG

**«НН»: А з Аўтуховічам ці Асіпенкам удавалася сустрэцца ў турме?**

**ЮЛ:** Аднойчы бачыў Мікалая на калідоры. Мяне вялі ў адзін бок, а Аўтуховіча — у іншы. Больш нікога не бачыў.

**«НН»: А як адбываўся арышт?**

**ЮЛ:** Было, як у кіно. А 7:00 раніцы ў кватэру на пятым паверсе прыйшло восем супрацоўнікаў «Алмаза». Пачалі праводзіць ператрус. Ён доўжыўся блізу паўтары гадзіны. Потым адвезлі ў мясцовы пастарунак. Там быў, здаецца, да пятай вечара. Мне адразу паведамілі, што я падазраюся ў артыкуле 218 КК «Падпалы маёмасці».

**«НН»: Адчувалі падтрымку з волі?**

**ЮЛ:** Так, з газет ведаў пра тое, што хлопцы з нашымі партрэтамі выходзілі на плошчы. Сукамернікі з вялікай цікавасцю чыталі газеты, дзе было напісана пра нашу справу. Увогуле, незалежныя газеты чытала ўся камера.

**«НН»: Які Ваш прагноз на далейшае развіццё справы?**

**ЮЛ:** Справа падоўжаная яшчэ на два месяцы. Следчы перакананы, што за гэты час яны яе скончаць. Думаю, што судовы разгляд справы пачнецца ў лістападзе.

**«НН»: У следства ёсць доказы Вашай віны?**

**ЮЛ:** Мне здаецца сам той факт, што мяне адпусцілі, сведчыць, што ніякіх доказаў у іх няма.

**«НН»: Вы не лічыце сябе вінаватым?**

**ЮЛ:** Канечне, не. Я абсалютна ніяк не датычны да гэтай справы. Упэўнены, як і мае калегі.

**Гутарыў ЗП**

# Расійская прэса: Мінск просіць Расію пра падатковыя палёгкі

У хуткім часе Мінск афіцыйна папросіць Маскву даць новыя падатковыя палёгкі для беларускіх тавараў, якія пастаўляюцца ў Расію, піша ў аўторак «Независимая газета».

Памочнік прэзідэнта Беларусі Сяргей Ткачоў прапанаваў плаціць ПДВ не з даты ўвозу беларускіх тавараў на тэрыторыю Расіі, а толькі пасля іх рэалізацыі. Ажыццяўленне гэтай ініцыятывы, па сутнасці, будзе азначаць новую форму кароткатэрміновага і сярэднетэрміновага крэдытавання беларускай эканомікі Масквой. Расійскія эксперты лічаць, што прадастаўленне такіх падатковых прэферэнцыяў можа быць абумоўленае палітычнымі ўмовамі.

**НБ**

## СЦІСЛА

### Януковіча выпісалі

Намесніка старшыні Партыі БНФ Аляксея Януковіча 7 жніўня выпісалі з бальніцы, куды ён трапіў пасля аварыі. Цяпер палітык знаходзіцца дома і ідзе на папраўку.

### Мілінкевіч сустрэўся са старшынёй Еўрапарламента

Сустрэча лідэра Руху «За Свабоду» з Ежы Бузкам адбылася 8 жніўня ў мястэчку Нідзіца. Мілінкевіч запрасіў Бузка на Беларускі Еўрапейскі форум, што адбудзецца ўвосень.

### Прыедзе памочнік Дзяржсакратара ЗША

14 жніўня Мінск наведае памочнік Дзяржсакратара ЗША па пытаннях Еўропы і Еўразіі Філіп Гордан.

### Новы пасол Вялікабрытаніі

Місія Найджэла Гулд-Дэвіса канчаецца ў верасні. Новым паслом Злучанага Каралеўства прызначаная Розмары Томас. Яна працавала ў Малдове, Украіне, Афганістане.

**ЗП**

# Рэкламная паўза рынку рэкламы

Рэклама — рухавік гандлю. Калі крызіс ударыў па айчыннаму гандлю, то яшчэ больш адчувальны ўдар быў нанесены рэкламнаму рынку Беларусі. Кіраўнік інтэрнэт-праекта marketing.by Сяргей Скараход абмаўлёўвае нярадасны стан рэкламнага рынку Беларусі:

— Па падліках спецыялістаў, рэкламны рынак Беларусі сёлета складзе $86,4 мільёнаў, скараціўшыся на 26%. У 2008 годзе гэты паказальнік дасягаў $116,1 мільёнаў. Узровень мінулага года мы зможам дагнаць толькі ў 2011 годзе. Праўда, гэта ўсё роўна адбудзецца хутчэй, чым у суседніх Украіне і Расіі.

Рынак інтэрнэт-рэкламы як самы перспектыўны сегмент застанецца на тым самым узроўні прыбытку, а вось астатнія складнікі рынку пойдуць уніз.

### $14000 за хвіліну рэкламы

Большая частка рэкламнага рынку належыць тэлебачанню. Яно займае каля 60%. Тэлебачанне захоўвае сваю высокую долю на рынку, бо мае невысокі кошт сувязі з аўдыторыяй. Пачатак трансляцыі ў Беларусі новых каналаў знізіў цэны яшчэ і яшчэ. Разам з тым маладыя людзі глядзяць тэлебачанне вельмі мала, хіба што музычныя каналы. Па падліках экспертаў, рынак рэкламы скароціцца на 25% і складзе каля 52 мільёнаў даляраў у год.

Самы дарагі канал па кошце рэкламнага часу ў Беларусі — АНТ. Перспектыва дагрукацца да самай вялікай аўдыторыі ў краіне вымагае адпаведнай аплаты. Хвіліна эфірнага часу каштуе ад $1500 да $14000 у прайм-тайм. Першы нацыянальны ацэньвае свае паслугі да $3500, а вось у СТВ і таго менш — не больш за $2000.

### 75% беларускай музыкі — перашкода на шляху рэкламы

Рынак радыёрэкламы ў Беларусі за год скароціцца ўдвая.

— Квота ў 75% беларускіх песень не дае магчымасці радыёстанцыям спецыялізавацца на пэўным музычным кірунку, прыцягваць асобную аўдыторыю, — адзначае Сяргей Скараход. — Амаль усе станцыі падобныя, яны вымушаныя круціць адно і тое ж.

У такіх умовах рэклама на радыёстанцыях становіцца ўсё таннейшай. Прынамсі, у параўнанні з тэлевізійнай. Напрыклад, на «Радыус-FM» хвіліна каштуе ад $18 да $70. Агулам жа рынак радыёрэкламы складае каля $6 мільёнаў.

### Самае слабае звяно

Рынак друкаваных сродкаў масавай інфармацыі працягвае страчваць ранейшыя пазіцыі. Больш за ўсё ад крызісу будуць пакутаваць дзелавыя выданні і глянцавая прэса.

«У канцы 2009 года ў Беларусі не застанецца ніводнага каляровага прыбытковага часопіса. Будуць існаваць датаваныя выданні і тыя, якія выдаюцца спонсарамі ў іміджавых ці нейкіх іншых мэтах», — мяркуе эксперт. Рынак у гэтым годзе зменшыцца прыблізна на 40% у параўнанні з леташнім і складзе каля $20 мільёнаў.

### Беларускамоўная рэклама

Рэклама, зробленая па-беларуску, дадае эфект арыгінальнасці і нечаканасці ва ўспрыманні насельніцтва. Буйныя кампаніі, такія як Samsung, Renault і іншыя, выкарыстоўвалі такую рэкламу ў іміджавых мэтах. Арыентуючыся на багатых і адукаваных пакупнікоў, яны не цураліся беларускай мовы, а выкарыстоўвалі яе як бізнэс-сродак. Але пасля таго, як яны моцна скарацілі выдаткі на рэкламу, беларускамоўнай рэкламы паменела. Па падліках экспертаў, яе доля на рынку не перавышае 5—7%.

**Ягор Марціновіч**

## Ігар Самкін: «Беларускае — самае маё» — наша ідэя

У Мінску ўжо стаіць каля 60 такіх білбордаў.

На вуліцах на білбордах з'яўляюцца выявы з беларускай васьміканцовай зорачкай і лозунгам, які нагадвае кампаніі «Купляйце беларускае» і «Будзьма». Звяртае на сябе ўвагу і слова «дзякуй» на штрых-кодзе.

Што хацелі сказаць гэтай сацыяльнай рэкламай, і хто яе прыдумаў?

«Гэта наша ідэя, — патлумачыў для «НН» выканаўчы дырэктар Асацыяцыі рэкламных арганізацый Беларусі Ігар Самкін. — Яна нарадзілася падчас размовы з прадстаўнікамі Міністэрства гандлю. Я выказаў меркаванне, што сацыяльная рэклама павінна быць лепшай, мець больш дакладны інфармацыйны характар.

Распрацавалі «Беларускае — самае маё» дызайнеры Асацыяцыі рэкламных арганізацый. У Мінску ўжо стаіць каля 60 выяваў, магчыма, хутка і ў рэгіёнах з'явяцца.

Усё гэта зроблена на добраахвотных пачатках. Хто далучаецца да нашай рэкламнай кампаніі, падтрымлівае ідэю, можа размясціць яе на сваіх білбордах. На дадзены момант так зрабілі ўжо 4 фірмы: «Каларэкспрэс», «Біг Борд», «Багема» і «Праспектпрэс».

Памятаеце рэкламную кампанію 1996—1997 гадоў «Купляйце беларускае»? Сёння гэтыя некалькі словаў усе ведаюць, а калісьці яе пачынала фірма «Біг Борд», таксама добраахвотна. Мы развілі тэму. Хацелася, каб гаворка ішла не толькі пра тавары, якія ляжаць на складах, але і пра людзей, якімі беларусы могуць ганарыцца. Не хочацца пырскаць пафасам, але гэта больш наша патрыятычная пазіцыя, чым рэклама».

**Настасся Шамрэй**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Аўтарытарнай мадэрнізацыяй Беларусі найбольш карыстаецца Расія

Доля Расіі ў прамых замежных інвестыцыях у Беларусь вырасла аж да 87%.

Ва ўмовах аўтарытарызму, русіфікацыі і прарасійскай арыентацыі інвестары прыходзяць пераважна з усходу. Доля Расіі ў агульным аб'ёме сродкаў, што надышлі ў беларускую эканоміку ў першым паўгоддзі, павялічылася ў два разы — з 33% да 66%.

Па прамых інвестыцыях дынаміка яшчэ больш уражвае — прырост з 16% да 86%, паведамляе «Ежедневник».

Усяго па статыстыцы аб'ём інвестыцый, што паступілі ў Беларусь за студзень-чэрвень 2009 года, склаў 4,23 млрд даляраў, у тым ліку прамых — 2,48 млрд даляраў.

Амаль 45% з агульнага аб'ёму прыцягненых рэсурсаў прыпалі на прадпрыемствы Мінэнерга — 1,9 млрд даляраў.

Другое месца па аб'ёмах атрыманых сродкаў заняў у 1-м паўгоддзі канцэрн «Белнафтахім», прадпрыемствы якога прыцягнулі 837,28 млн даляраў. Абсалютна ўсе гэтыя рэсурсы — крэдыты, якія прыцягваліся ў асноўным на забеспячэнне экспартна-імпартных аперацый у нафтавай галіне.

Адзначым добры паказнік прыватнага сектара. Юрыдычныя асобы без ведамаснай падначаленасці здолелі ва ўмовах крызісу прыцягнуць 1,37 млрд даляраў, з якіх амаль палова (719,62 млн даляраў) прыпала на прамыя інвестыцыйныя ўкладанні.

Расія, а канкрэтней — «Газпром» і нафтавыя кампаніі, сталі асноўнымі крыніцамі рэсурсаў для беларускай эканомікі. На долю расіян прыйшлося 66,7% усіх сродкаў, што паступілі (2,86 млрд даляраў), а прамых інвестыцый — аж 86,6% (2,14 млрд даляраў).

Проці аналагічнага перыяду мінулага года агульны аб'ём расійскіх інвестыцый павялічыўся ў 2,6 разоў, а прамыя ўкладанні — у 10,1 раза.

З першай дзесяткі краін, якія сталі галоўнымі крыніцамі прамых інвестыцый у 1-м паўгоддзі (Расія, Швейцарыя, Кіпр, Германія, Вялікабрытанія, ЗША, Літва, Латвія, Ліван і Эстонія), акрамя расіян, аб'ёмы ўкладанняў павялічылі толькі літоўцы.

**МБ; інф. «Ежедневник»**

## СЦІСЛА

### Дазвол на экспарт

Дзяржаўны мытны камітэт зняў абмежаванні на вываз тавараў з Беларусі фізічнымі асобамі. Каб вывезці любую колькасць рэчаў, дастаткова будзе паказаць на мяжы дакумент пра легальнасць іх набыцця. А вось патрабаванні наконт увозу тавараў у Беларусь, наадварот, будуць рабіцца больш жорсткімі.

### Чатыры беларускія банкі ў Топ-1000 банкаў свету

«Белаграпрамбанк» — найлепшы банк краіны па велічыні ўласнага капіталу. У сусветным рэйтынгу за год ён пераскочыў з 630-га на 321-е месца. «Беларусбанк» — на 452-м месцы. У спіс трапілі таксама «Прыёрбанк» і «БПС-Банк».

### У Мінскай вобласці ўводзіцца забарона на продаж піва

З 17 жніўня ў кіёсках і павільёнах Міншчыны купіць піва і слабаалкогольныя напоі стане немагчыма. Такое рашэнне прынята Мінаблвыканкамам. Прадпрымальнікі заяўляюць пра «антырынкавасць» рашэння.

### Беларусь пачала зарабляць на здабычы нафты за мяжой

«Беларуснафта» нарэшце атрымала першыя дывідэнды ад сумеснага венесуэльска-беларускага прадпрыемства па здабычы нафты. За мінулы год было здабыта 690 тысяч тон нафты. Цяпер у актыве прадпрыемства знаходзяцца пяць сумесных радовішчаў.

### «Лайф» працуе ў страту сабе

Трэці беларускі аператар мабільнай сувязі па выніках паўгоддзя патраціў $14,56 мільёнаў, атрымаўшы прыбытак $3,59 даляраў. Турэцкая кампанія Turkcell, якая валодае Life:), пакуль не можа кампенсаваць грошы, выдаткаваныя на будаўніцтва інфраструктуры і шырокую рэкламную кампанію.

### У Беларусі з'явяцца інвестыцыйныя агенты

Спецыяльныя пасведчанні інвестараў могуць атрымаць людзі, якія валодаюць «асабістымі дзелавымі якасцямі». Як мяркуюць улады, менавіта такія агенты будуць дамаўляцца з замежнымі інвестарамі і прыцягваць грошы ў Беларусь.

**ЯМ**

# Уласнік туркампаніі «Сакуб» апынуўся на нарах

**Такім чынам скончылася ягоная спрэчка з партнёрам па бізнэсе Гансам Хорнбахерам, грамадзянінам Германіі. Затрымалі Сяргея Букаса на наступны дзень пасля ягонага візіту ў Адміністрацыю прэзідэнта.**

Апошняга на радзіме самога вінавацяць у махлярстве і невяртанні пазык забудоўшчыкам на суму каля трацiны мільёна еўра. Аднак беларуская пракуратура ўстала на ягоны бок. А не на бок Сяргея Букаса, уласніка магутнай турыстычнай кампаніі «Сакуб». Букас апынуўся на лаве падсудных. 10 жніўня ягоную справу разгледзіць суд Савецкага раёна Мінска.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Хорнбахер і Болль» было зарэгістраванае ў 2003 годзе. Сузаснавальнікамі сталі турыстычная кампанія «Сакуб», якой кіраваў Сяргей Букас, і грамадзянін Германіі Ганс Хорнбахер. Асноўным відам дзейнасці «Хорнбахер і Болль» было прыцягненне сродкаў інвестараў для ўкладанняў у будаўніцтва жылля.

У тым жа годзе сумесна з будаўнічай фірмай «Вігеўрабуд» кампанія пачала будаваць элітны катэджавы пасёлак «Сонечны». Гэты праект трапіў у поле зроку незалежнай прэсы, бо пасёлак меў з’явіцца побач з мемарыялам Курапаты. Супраціў незалежнага грамадства змусіў забудоўшчыкаў скарэктаваць планы — пляцоўку пасунулі ўбок.

Аднак між партнёрамі пачаўся разлад. «Сакуб» чакаў ад немца інвестыцый. Той іх не забяспечваў. У інвестыцыйнай дамове «Хорнбахер і Боль» абавязвалася цягам 10 дзён пералічыць на будаўніцтва 430 млн рублёў. Аднак у Ганса ў Нямеччыне пачаліся фінансавыя цяжкасці, і ён не змог выканаць свае інвестыцыйныя абавязкі.

Тады Букас засумняваўся: нашто яму такі партнёр. Ён прапанаваў выкупіць ягоную долю. Немец быў гатовы выйсці з бізнэсу. Аднак хаўруснікі не сышліся ў цане. Паводле розных звестак, беларус гатовы быў даць максімум 150 тысяч даляраў. Немец жа хацеў паўмільёна. «Сакубу» гэта падавалася непрымальным. Агульны ўнёсак Хорнбахера ў «Хорнбахер і Болль» на той час быў не болей за 30 тыс. даляраў.

«Сонечны» пакрысе расце, на яго сайце прапануюцца кватэры на продаж. Але сёння перспектыва таўнхаўсаў паміж Баравой і Курапатамі не такая сонечная: 13 лютага 2009 года Гаспадарчы суд Мінска задаволіў патрабаванні ААТ «Сакуб» аб прызнанні нядзейснай дзяржаўнай рэгістрацыі ТАА «Хорнбахер і Болль». Асновай стала рашэнне суда Фрайбурга (Германія), паводле якога Хорнбахер прызнаваўся неплацежаздольным, яго запазычанасць перад крэдыторамі сягала 315,5 тысяч еўра. Акрамя таго, яшчэ ў 2001 годзе яго судзілі за махлярства, звязанае з атрыманнем сродкаў кліентаў на долевае будаўніцтва. На момант рэгістрацыі сумеснага прадпрыемства ў Беларусі Хорнбахер не пагасіў судзімасці і не кампенсаваў сваім нямецкім кліентам страты. Гэтыя факты ў сваёй анкеце, запаўненне якой неабходнае для рэгістрацыі кампаніі, ён не пазначыў. Чым парушыў беларускае заканадаўства, што і пацвердзіў Гаспадарчы суд сваім рашэннем.

Працэс будаўніцтва жылля на гэтым не спыніўся — суд дазволіў праводзіць плацяжы забудоўшчыку, а таксама выплачваць падаткі, зборы і іншыя абавязковыя плацяжы ў бюджэт. Але свайму поспеху беларускі бок кампаніі радаваўся нядоўга. 24 сакавіка Касацыйная калегія Вышэйшага гаспадарчага суда палічыла доказы непераканаўчымі, адмяніла рашэнне ніжэйшага Гаспадарчага суда і накіравала справу на новы разгляд.

## Беларускі фронт Ганса Хорнбахера

А праз два месяцы Сяргей Букас апынуўся пад вартай у СІЗА на Валадарскага. Пакуль Букас хацеў выйсці з сумеснага бізнэсу, немец падкапаўся пад беларуса. Крымінальная справа ў дачыненні да Букаса па ініцыятыве Хорнбахера была распачатая яшчэ ў 2008 годзе.

Беларускага бізнэсоўца звінавацілі ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі. Нямецкі партнёр вінаваціў мінскага калегу ў спробах захапіць кіраўніцтва кампаніяй пры дапамозе падробкі дакументаў. У лісце на імя Генеральнага пракурора Сяргей Букас даводзіў, што абвінавачанні на ягоны адрас не маюць пад сабой грунту. У сваю чаргу ён вінаваціў у махлярстве і спробах захопу бізнэсу свайго былога нямецкага кампаньёна.

Затрыманне Сяргея Букаса стала нечаканасцю для ягоных родных і знаёмых. Толькі што гаспадарчы суд паставіў, здавалася б, кропку ў справе няўдалай кампаніі, і тут пракуратура бярэ бок чалавека, якога самога вінавацяць у махлярстве, а за краты трапляе іншы.

Затрымалі Букаса на наступны дзень пасля ягонага візіту ў Адміністрацыю прэзідэнта. Ён хадзіў туды паскардзіцца і папрасіць абароны, і, акурат, затрыманне адбылася па ініцыятыве пракурора горада, якому следства накіравала справу для перадачы ў суд. Па словах юрыстаў, змяненне меры стрымання пракурорам на гэтай стадыі крымінальняга працэсу, з’яўляецца выключным.

«Я ведаў, што Сяргей паспяховы бізнэсовец, што ягоная турфірма — адна з найлепшых у Беларусі. Ён шмат аддаваў сродкаў на культурныя і забаўляльныя мерапрыемствы. І вось у канцы чэрвеня яго затрымалі», — кажа выдавец газеты «Борисовские новости» Анатоль Букас, стрыечны брат Сяргея.

Кіраўнік выдавецтва «Рыфтур» Сяргей Плыткевіч найперш прыгадвае спонсарскую дзейнасць Букаса. «Моцны бізнэсмен, стварыў сваю кампанію з нуля. Захапляецца фатаграфіяй, падводным плаваннем. Сумна, што так здарылася», — кажа сп. Плыткевіч.

## Ці ён, ці яго

Згодна з абвінавачваннем, Букас падрабіў заяву немца пра звальненне з пасады дырэктара і сам незаконна заняў яго пасаду. Акрамя таго, падчас дырэктарства ён, маўляў, скраў грошы немца.

Як? Пераканаў нямецкага патрнёра інвеставаць у будаўнічую дзейнасць таварыства шляхам давання беспрацэнтнай пазыкі. У выніку нямецкая кампанія, якую кантраляваў Ганс, зрабіла два плацяжы — 30 і 40 тыс. долараў. Праўда, не на рахунак «Хорнбахер і Боль», а на рахунак кампаніі «Ultima T&T Co., Ltd». На думку следства, гэта афшорная кампанія, якую кантраляваў Букас. Між іншым, гэтая кампанія насамрэч існуе і дзейнічае ў Тайландзе.

Акрамя гэтага, следства палічыла, што ўласнік «Сакуб» неправамерна заключыў дамову лізінгу з банкам, паводле якой за кошт фірмы набыў за 40 тысяч даляраў «Таёту Лэндкрузэр» для асабістага карыстання. І — верх усяго — Букас быццам бы неправамерна вызначыў сабе дырэктарскі заробак 2 мільёны рублёў у месяц.

У сваю чаргу, Букас стаіць на тым, што 70 тыс. даляраў ён не выкрадаў, бо не заключаў аніякай дамовы пазыкі і не атрымліваў грошай. «Ультыма T&T» з’яўляецца партнёрам «Сакуб» па турбізнесе з 1994 году. Як сцвярджае абвінавачваны, ён сапраўды ў 2000 годзе дапамагаў партнёрам з Тайланду адкрыць у латвійскім банку рахунак і меў адпаведную даверанасць на карыстанне ім, але гэты дакумент дзейнічаў цягам году і да моманту пералічэння сродкаў немцам Букас не меў права распараджацца рахункам «Ультымы T&T». На думку гаспадара «Сакуб», у Ганса былі свае ўзаемаадносіны з «Ультымай T&T». Ён прыводзіць ліст кіраўніцтва гэтай кампаніі, у якім гаворыцца, што яно давала Гансу грошы і той яшчэ не цалкам з імі разлічыўся.

Букас настойвае, што абвінавачванні нічога не вартыя. Ганс аперуе дамовай пазыкі з адной кампаніяй, паводле якой грошы пералічаныя на рахунак другой. Паводле словаў Букаса, банк проста не прыняў бы такі плацёж, калі да дамовы няма дадатковага пагаднення, у якім пазначаны іншы атрымальнік.

## Справа тураператараў

Справа Сяргея Букаса развіваецца на тле чутак пра затрыманні сярод кіраўніцтва турыстычных кампаній. У каментарах да такіх паведамленняў можна пабачыць не адно меркаванне, што дзяржава збіраецца такім чынам папоўніць бюджэт, праводзяцца паралелі з уласнікам рынку «Ждановічы» Яўгенам Шыгалавым, які пасля арышту згадзіўся кампенсаваць дзяржаве шматмільённыя страты.

«Прыклад Сяргея Букаса сведчыць пра тое, што ў нашай краіне можна затрымаць любога бізнэсоўца, было б на тое жаданне», — кажа адзін з прадстаўнікоў «Сакуба».

Выглядае, што ў справу ўцягнутыя са сваімі інтарэсамі некаторыя праваахоўныя органы. Уся гэтая гісторыя пацвярджае неабходнасць выпрацоўкі ясных механізмаў, якія аддзяляюць праваахоўнікаў ад бізнэсу.

**Сямён Печанко**

# Юрыстка кампаніі «Хорнбахер і Болль»: «Крызіс куды страшнейшы для нашага бізнэсу, чым гэтыя скандалы»

**Наталля Дудко, юрыстка кампаніі «Хорнбахер і Болль», прадстаўляе ў судах інтарэсы Ганса Хорнбахера.**

**«Наша Ніва»: З чаго пачаўся канфлікт паміж партнёрамі па бізнэсу? Мінскі бок цвердзіць, што Хорнбахер не здолеў прыцягнуць неабходныя інвестыцыі.**

**НД:** Акурат Хорнбахер і прыцягнуў неабходныя для старту сродкі, кампанія «Сакуб» грошы не давала. Потым ён рэгулярна рабіў запыты з Германіі і ўвесь гэты час толькі і чуў, што бізнэс непрыбытковы, рэнтабельнасць нулявая. У выніку Хорнбахер вырашыў выйсці з долі, прадаўшы яе «Сакубу». Але там не пагадзіліся з прапанаванай ім цаной. І Ганс пачаў высвятляць, што гэта за людзі. Былі выяўленыя факты падробкі дакументаў. У выніку была ініцыяваная крымінальная справа.

**«НН»: Дзе цяпер Хорнбахер, што адбываецца цяпер з кампаніяй?**

**НД:** Хорнбахер знаходзіцца ў Германіі. Большасць супрацоўнікаў застаюцца на сваіх пасадах.

**«НН»: Мы чулі пра незайздросны лёс кліентаў кампаніі…**

**НД:** Фінансавы крызіс надзвычай балюча ўдарыў па будаўнічай сферы. І яго наступствы куды страшнейшыя для нашага бізнэсу, чым гэтыя скандалы. І на мой погляд, як простай грамадзянкі, а не юрыдычнага прадстаўніка каго б там ні было, безумоўна, спрэчкі Букаса, ягоных калег па «Сакубе», ці нават таго ж Хорнбахера, сітуацыю ў кампаніі не паляпшаюць.

**Гутарыў СП**




**Туркампанія «Сакуб»** была заснаваная ў 1993 і неўзабаве выйшла ў лік лідэраў турыстычнага рынку Беларусі. Мае офісы на праспекце Машэрава і вул. Кульман у сталіцы, а таксама авіякасы. Прапануе адпачынак ў дзесятках краін свету і Беларусі.

## СЦІСЛА

### А тачкі гараць і гараць

У адным з выпадкаў супрацоўнікі праваахоўных органаў дакладна высветлілі, што прычынай пажару стаў падпал. Супраць 21-гадовага маладога чалавека, які такім чынам вырашыў прыцягнуць увагу сваёй палюбоўніцы, распачатая крымінальная справа. Падпальшчыку пагражае ад 3 да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Тым часам «Mercedes» згарэў каля гатэля «Crowne Plaza Minsk» — аднаго з самых прэстыжных гатэляў беларускай сталіцы.

### Палачанін прывёз у Маскву торбу з тратылам

На Беларускім вакзале расійскай сталіцы знайшлі тыповы набор тэрарыста: тратыл, гранату, патроны, дымавыя шашкі і электрадэтанатары. Торбу з самым сапраўдным наборам тэрарыста ў Маскву прывёз цягніком №40 невядомы мужчына з Полацка. Яго шукаюць.

### У Мінску павесіўся міліцыянт

Гэта здарылася ў лесапарку каля вуліцы Гурцьева. Рахункі з жыццём звёў сяржант патрульна-паставой службы. Сёлета гэта ўжо другое самагубства супрацоўніка міліцыі ў Мінску і чацвёртае ў Беларусі. У ГУУС Мінгарвыканкама нічога не кажуць з нагоды таго, што здарылася, і не хочуць каментаваць прычыны сыходу з жыцця супрацоўніка міліцыі.

### Пенсіянерка забіла мужа малатком

Труп 64-гадовага мужчыны са слядамі пабояў знайшлі ў ягонай уласнай кватэры. Смерць наступіла ад чэрапна-мазгавой траўмы. Следчымі органамі папярэдне ўстаноўлена, што яны з жонкай выпівалі, пасварыліся, і яна яго і стукнула малатком. Абодва пенсіянеры.

### ДАІ шукае кіроўцу, які збіў 13-гадовага хлопчыка

Выпадак здарыўся 4 жніўня (аўторак) а 21-й у праездзе ля дзіцячага садка па вуліцы Валгаградскай, 27б. У пацярпелага медыкі выявілі шматлікія ўдары і пашкоджанне звязак правага запясця. Відавочцаў просяць патэлефанаваць на нумар 222-17-17 ці 102.

**ВЖ; СП; Мінск-навіны**

# Не мы, дык хоць нашы свінні

**Чаму тутэйшым свінням еўрастандарты пасуюць, а вось тутэйшаму люду — шкодныя? Піша Аляксандр Класкоўскі.**

Лукашэнка абвясціў перабудову і нават рэвалюцыю ў свінагадоўлі. Пра гэта заяўлена 7 жніўня ў Ляхавіцкім раёне.

«У свінагадоўлі з вашай гаспадаркі пачынаецца рэвалюцыя. Мы выбралі галандскія і дацкія тэхналогіі ў якасці ўзору, паводле якога будзем перабудоўваць усю свінагадоўлю Беларусі», — паведаміў галоўны начальнік дырэктарцы аграпрадпрыемства «Белдан».

Таксама абяцана, што да 1 студзеня 2010 года цалкам на еўрапейскія нормы выйдзе будаўнічая галіна. Карацей, «з 2011 года, я упэўнены, мы будзем жыць, як у Еўропе, падцягнуўшы і іншыя напрамкі».

Няцяжка здагадацца, што гаворка ідзе выключна пра галіны эканомікі. Тут кіраўніцтва краіны відавочна саспела да высновы, што «вось узор... нічога прыдумляць не трэба, мы ўжо бяром гатовыя тэхналогіі. Сёння іх трэба выцягваць з Еўропы».

Заўважце: калі датычна замежнай палітыкі нядаўна абвешчана, што мы, маўляў, не будзем рабіць выбар між Расіяй і ЕС, то ў галіне тэхналогій альтэрнатывы няма.

У свінагадоўлі, як бачым, загадана без роздуму браць галандскія і дацкія ўзоры. Будаўнікі таксама мусяць арыентавацца на заходнія стандарты.

Наверсе выдатна разумеюць, што Расія нас не мадэрнізуе. З ёй застаецца хіба ваяваць за рынак збыту пераважна састарэлага тавару.

Што ж, настрой на гаспадарчую мадэрнізацыю, калі адкідаецца ўсялякая ідэалагічная лухта, можна толькі вітаць.

Але згадваецца нядаўні выступ Лукашэнкі перад кіраўнікамі




дыпмісій, калі ён імпэтна даводзіў, наколькі шкодна ўкараняць у нас заходнія ўзоры дэмакратыі. Маўляў, «важная ды патрэбная не вонкавая «дэмакратычная» абалонка. І тым болей не прывезеная і не накінутая звонку. Такая спехам прышчэпленая дэмакратыя няўстойлівая...». Яшчэ болей, «такія «мічурынскія» практыкаванні робяць цяжкапапраўную шкоду краіне, эканоміцы і, урэшце, народу».

Карацей, у свінагадоўлі тэхналогіі краін ЕС — самае тое, а вось у палітыцы — горай за свіны грып. Мо хто патлумачыць уцямна, чаму тутэйшым свінням еўрастандарты пасуюць, а вось тутэйшаму люду — шкодныя?

Калі ж сур’ёзна, то вялікае пытанне, наколькі запрацуюць тыя супер-пупертэхналогіі, калі вёска спілася, а начальства ведае толькі мацюкі ды пугу.



# Выбар Айчыны

**Выбар між Беларуссю і Польшчай робяць сотні юнакоў і дзяўчат. Піша Алесь Пілецкі.**

Кажуць, што кожны сапраўдны расіец жадае пераехаць жыць у Парыж. Для беларусаў усё складаней. Але пэўна, што думкі некаторай часткі скіраваныя ў варшаўскім кірунку. Нездарма ў сучаснай Польшчы беларусы складаюць другую па колькасці (пасля ўкраінцаў) групу эмігрантаў.

Сярод іх дастаткова шмат моладзі, якая пасля сканчэння вучобы ў Польшчы там і застаецца. Паступіць у Польскую акадэмію навук па дактаранцкай праграме, калі ты паходзіш з краіны — былой рэспублікі СССР — даволі проста. Дастаткова ведаць польскую мову і арыентавацца ў сучасных навуковых тэндэнцыях, каб падаць дастаткова цікавы праект. А мноства стыпендыяльных праграм для кандыдатаў з былога СССР забяспечаць прымальнае жыццё нават без дадатковых сродкаў фінансавання.

Можна таксама пайсці працаваць. Звычайна беларусы (як і ўкраінцы) працуюць у фірмах, што гандлююць з Расіяй. Уладкавацца на такую працу дапамагае добрае валоданне расійскай мовай, якое цяпер нячаста сустрэнеш у Польшчы. Легальная праца дазваляе спачатку атрымаць працоўную візу, а потым і часовы дазвол на жыхарства.

Аднак не ўсе беларускія выпускнікі застаюцца за мяжой, хаця спакуса зрабіць гэта даволі вялікая. Кожны кіруецца ў сваім выбары цэлым шэрагам прычын.

Беларусь прайграе найперш па ўзроўні жыцця. У Польшчы хіба толькі камунальныя плацяжы, сфера абслугоўвання ды транспарт даражэйшыя. Прадукты, адзенне, бытавая тэхніка — усё гэта таннейшае. А заробкі ў Беларусі з польскімі ў параўнанне не ідуць. Адзіным пунктам, па якім Беларусь можа выглядаць прывабней — гэта медыцынскае абслугоўванне. Паслугі ж прыватных медыцынскіх цэнтраў могуць сабе дазволіць далёка не ўсе.

Іншая рэч, якая здольная заставіць задумацца аб вяртанні ў Беларусь, — гэта татальная хмурнасць і раздражнёнасць людзей. Усмешкі на вуліцах беларускіх гарадоў — рэдкасць. А вось нараканні і галас — норма. Справа нават не ў малых заробках (ва Украіне сітуацыя яшчэ горшая, ды і ў Польшчы далёка не кожны пахваліцца добрымі прыбыткамі), а ў нейкай своеасаблівай атмасферы напружанасці, да якой неабходна адаптоўвацца некаторы час пасля прыезду на Радзіму. З хамствам у Беларусі можна сутыкнуцца паўсюль: у краме, транспарце і проста на вуліцы, і тое вельмі напружвае. Асабліва, калі прызвычаіцца да ветлівасці.

Прынята лічыць, што шмат хто застаецца за мяжой з палітычных матываў. Вядома, у Мінску адразу кідаецца ў вочы прысутнасць дзяржаўнай ідэалогіі. Збольшага тое праяўляецца ў праслаўленні перамогі ў апошняй вайне. Невялікая, у параўнанні з Варшавай, колькасць вонкавай рэкламы ў Мінску кампенсуецца разнастайнымі расцяжкамі, плакатамі і шчытамі «патрыятычнага характару». Аднак гэта не ёсць нечым унікальным. Кожны, хто хоць трохі пажыве ў польскай сталіцы, заўважыць падобную з’яву. Сутыкнуцца з праслаўленнем Варшаўскага паўстання, што адбылося ў жніўні 1944 года, можна паўсюль. Існуе нават адмысловы музей, цалкам прысвечаны гэтым падзеям. Паралелі з Беларуссю відавочныя. Ніводная гістарычная падзея не прадстаўлена ў масавай культуры Польшчы так, як згаданае паўстанне. Хіба толькі асоба маршалка Пілсудскага можа пацясніць яго. Змяняючы краіну, проста сутыкаешся з іншай ідэалогіяй. Для беларускай моладзі, якую збольшага нельга назваць грамадска актыўнай, палітычная сістэма не мае вырашальнага значэння. Шмат важнейшай з’яўляецца адкрытасць польскіх межаў, што дазваляе вольна падарожнічаць, ды значна больш цесная інтэграванасць Польшчы ў агульнаеўрапейскае культурнае жыццё.

Што да культурнай розніцы, то яна вельмі выразная. У Польшчы дамінуе нацыянальная культура. Мінск жа не можа пахваліцца выразнай беларускасцю. Прычына гэтаму не ў глабалізацыі, а ў савецкай спадчыне. Адсутнасць старбаксаў хутчэй дадае Мінску адметнасці. Аднак раней ці пазней яны тут паўстануць...

У цэлым нельга сазаць, што Мінск і Беларусь выглядаюць значна горш ці лепш за Варшаву і Польшчу. Выглядаюць іначай. Гэтая своеасаблівасць здольная прываблівать. Прычым не толькі замежных турыстаў, але і шматлікіх маладых эмігрантаў. Стаць сваім за мяжой даволі складана, нават калі пражыў там доўгі час. Пастаяннае адчуванне чужароднасці здольнае паслужыць прычынай вяртання моладзі на Радзіму. Аднак пакуль у Беларусі рэдка можна знайсці прымяненне ведам і ўменням, якія атрыманыя ў польскіх універсітэтах, і гэта, напэўна, галоўная прычына «ўцёкаў маладых мазгоў».

# Як у Еўропе — гэта як?

«З 2011 года мы будзем жыць, як у Еўропе», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка. Што для Вас значыць выраз «жыць па–еўрапейску»? — запытаўся карэспандэнт «НН» у людзей на вуліцы.

**Вольга, 20 гадоў:** Я не ведаю як гэта — жыць па-еўрапейску. Мы тут усе па-беларуску жывём. Адкуль мы можам ведаць, як там жывуць людзі ў Еўропе?

**Андрэй, 42 гады:** Для мяне жыць па-еўрапейску — гэта значыць мець якаснае медыцынскае абслугоўванне, гарантыі бяспечнага жыцця, быць упэўненым, што з маімі дзецьмі нічога не здарыцца, калі я адпускаю іх у школу.

**Павел, 28 гадоў:** Жыць па-еўрапейску — гэта значыць адчуваць сябе абароненым з боку дзяржавы, найперш у юрыдычным сэнсе. Мець магчымасць звярнуцца ў суд, не баючыся, што там праўды не знойдзеш.

**Кацярына, 24 гады:** Асабіста для мяне «еўрапейскасць» заключаецца ў іншай культурнай прасторы, магчымасці адчуваць сябе ў асяроддзі, якое кардынальна адрозніваецца ад нашага беларускага, прапітанага постсавецкай спадчынай.

**Валерый, 69 гадоў:** Жыць па-еўрапейску — гэта значыць быць свабодным, адчуваць сябе беларусам і жыць не ў беднасці, а ў дабрабыце.

**Алена, 43 гады:** Па-еўрапейску — гэта значыць разам з Еўропай, а не асобна ад яе. Проста жыць прыстойна.

**Генадзь, 50 гадоў:** Для мяне жыць па-еўрапейску — гэта найперш жыць забяспечана ў матэрыяльным плане. Мець добры заробак, які б дазволіў не толькі выжываць, але і адпачываць. Падарожнічаць. Хай сабе і не за межы Беларусі, а на Нарач.

**Насця, 24 гады:** Жыць па-еўрапейску. Для мяне гэта проста добразычлівыя твары на вуліцах, а таксама правa на ўласнае меркаванне.

Як бачым, для большасці людзей «як у Еўропе» значыць высокі ўзровень дабрабыту. Але ёсць і тыя, хто ідзе далей...

**Апытваў Алесь Пілецкі на вуліцы Залатая Горка ў сталіцы**

# Залатая рыбка Еўропа

Сваё разуменне сэнсу словаў «жыць, як у Еўропе» тлумачыць журналіст «НН» **Алесь Кудрыцкі**, які больш за два гады пражыў у Германіі і Бельгіі.



Еўропа — як тая залатая рыбка. Спрабуеш злавіць яе, а яна ўвесь час выслізгвае паміж пальцаў. Чым лепей ведаеш яе часткі, тым складаней сабраць іх у нешта цэлае. Я не магу акрэсліць, што такое Еўропа, дзе яна пачынаецца і дзе сканчаецца. Ісландская вёсачка на ўзбярэжжы халоднага мора — гэта, без сумневу, Еўропа. Ці вось, напрыклад, Стамбул — неяк не паварочваецца язык назваць гэты горад азіяцкім. Лісабон, які пазірае цераз Атлантыку ў Новы Свет — таксама Еўропа. А калі ўважліва прыгледзецца, і ў Смаленску таксама можна адшукаць еўрапейскасць.

Еўропа — яна розная.

Можа быць, Еўропа — гэта край, дзе ўсе жывуць заможна? Але завітайце ў сталіцу Еўропы, Брусэль. Вось мы стаім у цені шкляных хмарачосаў у фінансавым раёне. Угары бляск вялікіх грошай, а ў падземным пераходзе грэюцца, завярнуўшыся ў брудныя коўдры, валацугі — кампанія чалавек у дванаццаць. Большасць з іх перамаўляюцца між сабою па-польску. Як бачна, еўрапейская інтэграцыя не абышла бокам і жабракоў. Карціна робіцца яшчэ больш гратэскавай, калі даведваешся, што хмарачосы будаваліся пры ўдзеле сродкаў аднаго з бельгійскіх мафіёзных вараціллаў.

Ці, напрыклад, возьмем тыповае еўрапейскае места — Гамбург. Вузкая вулачка з дарагімі буцікамі і элегантнымі кавярнямі — усе столікі занятыя. Я еду на ржавым ровары і баюся зрабіць лішні рух. Справа ад мяне — чырвоны «ферары», злева — жоўты «поршэ». Падрапаеш ім бок — будзеш мець праблему. А вось усходняя Нямеччына, мястэчка Гера. Навокал — шэры панэльны раён, акурат мінскія Шабаны. Увечары тут не гарыць добрая палова вокнаў у кватэрах, бо жыхары з'ехалі: няма працы, няма грошай. Тая самая краіна, тая самая Еўропа, а розніца ў дабрабыце велізарная, амаль цывілізацыйная. «Жыць, як у Еўропе» — гэта як у Гамбургу ці як у Геры? Незразумела.

Нашмат лягчэй сказаць, што значыць жыць не па-еўрапейску. Гэта —спраўляць малую патрэбу на лесвічнай пляцоўцы свайго ўласнага дома. Тупа падпарадкоўвацца, калі цябе нахабна эксплуатуюць ды адкрыта здзекуюцца. Слепа верыць у тое, што за цябе тваё жыццё наладзіць разумны кіраўнік. Прымаць загады і догмы без лішніх пытанняў. Хаваць галаву ў плечы, бо «ініцыятыва заўжды бывае пакаранай». Не ведаць, хто ты такі, кім былі твае продкі, і як называецца места, дзе ты жывеш. Усё гэта — жыць не па-еўрапейску. Зрэшты, што такое Еўропа, гэта ўсё роўна не тлумачыць.

Але ўсё ж ёсць у чароўных словах «жыць, як у Еўропе» невытлумачальная прыцягальнасць.

Мне здаецца, што няўлоўную рыбку еўрапейскасці я схапіў за хвост у Рыйксмузеі ў Амстэрдаме, калі разглядаў знакамітую «Начную варту» Рэмбрандта. На карціне — рота мушкецёраў амстэрдамскага паспалітага рушання. Твары адкрытыя, упэўненыя, поўныя годнасці. Гэта людзі, якія ахоўваюць не правадыра ці князя, а свае сем'і, свой горад, свой лад жыцця. І таму гэты абавязак для іх — як свята. Жыць па-еўрапейску — значыць з уласнай волі гуртавацца для таго, каб зладзіць сабе лепшае жыццё. Еўрапейскасць — гэта салідарнасць. А ўсё астатняе прыкладзецца.

Надоечы, збіраючыся ў вандроўку ў Глыбокае, я шукаў у інтэрнэце інфармацыю пра гэтае беларускае мястэчка і, знайшоўшы, адразу ўзгадаў «Начную варту». Уявіце сабе такую карціну: 24 ліпеня 1667 г. марадзёры вугорскай харугвы польнага гетмана Валовіча ладзяць набег на Глыбокае. Але паспалітае рушанне глыбачанаў памерам у некалькі сотняў чалавек дае нападнікам дыхту — вугорцы адступаюць, страціўшы трох забітых, шмат параненых, пагубляўшы мушкеты, шаблі ды нават ротную казну. А падчас Паўночнай вайны, каб бараніцца ад рабункаў з боку замежных вайсковых атрадаў, паводле загаду Глыбоцкага магістрата, кожны дом мусіў мець бярдыш ці алебарду, а таксама ружжо, якое правяралася штогод на свята св. Міхала. Чытаеш і з цяжкасцю даеш веры, што гэта — Беларусь. Вось гэта традыцыі, вось гэта рэаліі! Сапраўдная Еўропа.

Пакорпайся як след у еўрапейскай свядомасці ды гісторыі і раней ці пазней дакапаешся да залітых сонцам выспаў Старажытнай Грэцыі. Невялічкія полісы грэкаў, аб'яднаныя адзінай культурай, не маючы супольнага ўладара. Яны бясконца сварацца адзін з адным, але заўжды гуртуюцца і даюць адпор азіяцкім захопнікам з іх строгай вертыкальнай арганізацыяй бруальнай улады.

Менавіта гэтую салідарнасць, здольнасць дамовіцца, згуртавацца на роўных, зладзіць сабе ўласную зону камфорту на гэтай зямлі, з нас усяляк выбівалі, прышчапляючы лагерную свядомасць. Еўропа — гэта калі мы жывём разам, на роўных, а не як бязмоўныя авечкі пад наглядам ваўкоў-паханоў. Зладзіць еўрарамонт у свінарніку — гэта яшчэ не значыць зажыць па-еўрапейску. Галоўнае — хто, як і нашто будзе той рамонт рабіць.

**Алесь Кудрыцкі**

# Аляксей Валабуеў: Еўропа — гэта і добрыя дарогі

Салігорскі інжынер Аляксей Валабуеў гэтым летам на ўласным аўтамабілі аб'ехаў дзесяць краін Еўропы. Ці адчуў ён розніцу паміж краінамі Еўрасаюза і Беларуссю. Што пасля гэтай паездкі для яго значыць фраза «жыць, як у Еўропе»?



«Мая вандроўка была турыстычная, таму першае, што кінулася ў вочы — гэта еўрапейская інфраструктура. Гэта проста іншы свет, абсалютна іншы ўзровень. У які б маленькі гарадок ты ні заехаў, там абавязкова будуць кавярні, бары, разнастайныя крамы для турыстаў, гатэлі. Я ўжо не кажу пра выдатныя дарогі. І гэта не толькі якасць пакрыцця, але ж узровень бяспекі дарожнага руху. Мяне як кіроўцу гэта асабліва ўразіла. Здавалася б, нейкая дробязь, як то дадатковая паласа перад кожным паваротам на звычайных прыгарадных дарогах, альбо магчымасць павярнуць направа пры чырвоным колеры святлафора. У нас жа выдумляюць праграмы—100 і прымушаюць насіць флікеры, замест таго каб зрабіць паўнавартаснае асвятленне ў горадзе.

Вось такі прыклад. Гуляючы па Празе, мы пабачылі акцыю салідарнасці з іранскім народам. Ніякіх амонаўцаў, ніякіх разгонаў. Мы таксама далучыліся.

Потым мы завіталі на цэнтральную плошчу чэшскай сталіцы, дзе адбываўся джаз-фэст. Ізноў-такі, ніякіх металашукальнікаў, ніякіх паліцэйскіх. Некалькі ахоўнікаў. Людзі абсалютна разняволеныя. Наўпрост сядзяць на брукаванцы насупраць сцэны. Слухаюць музыку, п'юць піва. Піва, дарэчы, прадаецца проста каля сцэны, а не ў пяцістах метрах ад яе. А як інакш».

**Запісаў Зміцер Панкавец**

# У беларусаў найменшая мінімалка ў Еўропе

У канцы ліпеня статыстычнае агенцтва Eurostat апублікавала звесткі пра мінімальныя заробкі ў розных еўрапейскіх краінах. У шасці краінах Еўрасаюза заробак перавышае 1000 еўра. Тройку лідэраў склалі Люксембург (1642 еўра) , Ірландыя (1462 еўра) і Бельгія (1387 еўра).

Мінімальная заработная плата — гэта мінімальная сума, якую працадаўца можа заплаціць супрацоўніку. Звычайна яна складаецца без уліку падаткаў. Самы малы мінімальны заробак сярод краін ЕС атрымліваюць жыхары Румыніі (153 еўра) і Балгарыі (123 еўра).

Беларуская мінімалка не дацягвае нават да гэтых еўрапейскіх паказчыкаў. Паводле дадзеных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны РБ, яна складае 229 700 беларускіх рублёў (57 еўра). Больш за беларусаў атрымліваюць усе бліжэйшыя суседзі. Мінімальны заробак у Польшы — 281 еўра, у Літве — 232 еўра, у Расіі — 99 еўра, ва Украіне — 73 еўра.

Самае прыкрае, што ў Польшчы мінімалка большая, чым у Беларусі сярэдні заробак.

**ВЖ**

# Налета пачнуць браць абы-каго

Гэты год быў апошнім цяжкім для паступлення ў ВНУ.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Уступная кампанія 2009 падышла да свайго лагічнага заканчэння. Абітурыенты падзелены на два лагеры — шчасліўчыкаў са студэнцкімі білетамі і не надта паспяховых людзей, якім у вышэйшай адукацыі адмоўлена, прынамсі сёлета. Тым, чыя чарга паступаць прыйдзе налета, ужо зараз час абіраць сабе канкрэтную вышэйшую навучальную ўстанову.

### Ахвотнікаў нашмат больш не стала

Асаблівасць сёлетняй уступнай кампаніі ў тым, што ва ўніверсітэты паступалі прадстаўнікі дзвюх паралеляў — 11-ы і 11-ы «рыска» класы. Нягледзячы на несуцяшальныя чаканні наконт павелічэння колькасці абітурыентаў ледзь не ўдвая, нічога страшнага не адбылося. Ахвотных паступаць было толькі на 10—15% больш, чым летась. Сказала сваё важкае слова дэмаграфія. У пачатку 1990-х нараджальнасць пачала катастрафічна падаць. У наступным годзе варта чакаць рэзкага змяншэння, бо паступаць будуць народжаныя ў 1992-1993 гадах.

### Конкурс ці прахадны бал?

Спробы спецыялістаў ранжыраваць прэстыжнасць універсітэтаў паводле конкурсу страціла сэнс. На самыя элітныя спецыяльнасці (кшталту міжнародных адносін, якія рыхтуюць кадры для Міністэрства замежных справаў) конкурсу амаль няма. Абітурыенты з нізкімі баламі нават не спрабуюць падаць туды дакументы. Конкурсу няма — а прахадны бал перавышае 350 балаў (з 400 магчымых). Асноўная інфармацыя — менавіта бал, з якім абітурыент можа прэтэндаваць на залічэнне ва ўніверсітэт. Конкурс цікавы толькі для спецыяльнасцяў, на якіх прымаўся дадатковы экзамен. Там абітурыенты здавалі сертыфікаты і атэстат, разлічваючы менавіта на творчую частку іспыту.

### Выдатнікі і двоечнікі адначасова

Выявілася, што конкурс атэстатаў патрохі пераўтвараецца ў прафанацыю. Створаны з мэтай даць перавагу рознабакова дасведчаным школьнікам, цяпер ён выклікае толькі смех. Школьныя настаўнікі, спрабуючы дапамагчы сваім выпускнікам, значна завышаюць атэстаты. Што казаць, калі сярэдні бал атэстата студэнта першага курса БДУ складае... 9,0 бала! І гэта пры тым, што на цэнтралізаваным тэставанні па расійскай мове больш за 50 балаў набрала толькі 20% абітурыентаў.

### Прахадны бал узрос

Тым не менш, агульны прахадны бал у гэтым годзе аказаўся ў сярэднім на 20-30% вышэйшым за мінулагадовы. Па меркаванні кіраўніка ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Юрыя Міксюка, гэта выклікана лепшымі вынікамі цэнтралізаванага тэставання, чым у 2008 годзе. Рэч у тым, што праграмы для тэставання былі спрошчаныя, каб стварыць роўныя ўмовы для тых, хто вучыўся ў 11-м і 11-м «рыска» класах. Як след, максімальны вынік — 100 балаў па адным з прадметаў — атрымалі 206 абітурыентаў. Супраць 77 летась. А вось агульная сума балаў аказалася найбольшай у выпускніцы Бабруйскага ліцэя Яніны Пінчук — 392 балы! 100 па беларускай мове, перамога на алімпіядзе па грамадазнаўстве плюс 96 балаў за ангельскую мову. Яна прэтэндавала на паступленне на факультэт міжнародных адносін БДУ. Зразумела, што паспяхова.

### Вёска даганяе горад

Раней гарадскія школьнікі спрабавалі з’ехаць вучыцца ў апошні год навучання ў сельскую школу, каб атрымаць ільготы для паступлення. Такой магчымасці Міністэрства адукацыі іх пазбавіла. Цяпер «гарадскія» можна адпраўляць у вёску проста павучыцца — выпускнікі сельскіх школ паказваюць нечакана добрыя вынікі.

Шмат каму з іх — 36% у БДУ — не спатрэбіліся «сельскую» льготы, бо аказалася, што гарадскі конкурс ніжэйшы за вясковы. Такая сітуацыя склалася на геаграфічным, гістарычным, фізічным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а таксама на большасці спецыяльнасцяў у філолагаў.

### 17 чалавек на дызайнерскае месца

Галоўная навучальная ўстанова краіны — **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** — адзначылася не толькі высокім узроўнем вясковых абітурыентаў. Высокія прахадныя балы — адна з уласцівасцяў БДУ.

Самы высокі прахадны бал сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў быў зафіксаваны на спецыяльнасці «камп’ютарная бяспека» факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (358 балаў). Для гуманітарыяў складаней за ўсё было трапіць на спецыяльнасць «інфармацыя і камунікацыя» факультэта філасофіі і сацыяльных навук (353). Лідэр сярод эканамічных спецыяльнасцяў — «Сусветная эканоміка» (357).

З творчых спецыяльнасцяў самы вялікі розгалас зрабіў «дызайн — камунікатыўны дызайн» гуманітарнага факультэта. Для таго, каб трапіць туды, варта было набраць 41,2 бала (з 50 магчымых). Апошні іспыт быў творчым, і паспрабаваць свае сілы ў ім вырашыла агромністая колькасць ахвотных. Конкурс склаў 17 чалавек на месца.

> Конкурс атэстатаў ператвараецца ў прафанацыю. Школьныя настаўнікі, спрабуючы дапамагчы сваім выпускнікам, значна завышаюць атэстаты.

### Ду ю спік інгліш?

У **Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце** (Інязе) самым прэстыжным факультэтам застаецца перакладніцкі. Англійская (344 балы) і нямецкая (342) мовы такія ж перспектыўныя, як і раней. Прахадныя балы на іх застаюцца ў межах статыстычнай пагрэшнасці — плюс-мінус 10 балаў у параўнанні з мінулым годам. Найніжэйшы прахадны бал быў для аматараў нямецкай мовы, літаратуры і рыторыкі — 258 балаў. Для сяльчан можна было ўладкавацца на іспанскамоўны факультэт і з 199 баламі.

### «Збіўся з дарогі — ідзі ў педагогі»?

Лагапед і псіхолаг — самыя прэстыжныя спецыяльнасці ў **Беларускім педагагічным універсітэце імя М.Танка** (298 і 296 балаў адпаведна). А вось класічная прафесія — настаўніка — не патрабуе высокага ўзроўню ведаў. Ад 165 балаў на фізіку да 271 на гістарычныя спецыяльнасці. Стаць настаўнікам беларускай мовы і літаратуры можна і атрымаўшы 19,3 бала (з 40).

### Хто вылечыць Беларусь

У **Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце** складаней за ўсё трапіць у стаматалогі (359 для горада / 304 для вёскі). Прыкладны ўзровень лячэбнага і педыятрычнага факультэтаў — 320/230. Вайскова-медыцынскі факультэт патрабуе 250 балаў.

### Чамадан-вакзал-Расія ад БНТУ

Ноу-хау ад **Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта** — цікавая прапанова для тых, хто не прайшоў конкурс на бясплатнае навучанне. Ім прапануецца паспрабаваць сябе ў конкурсе ў расійскія ВНУ. Дзевяцярых абітурыентаў адправяць вучыцца ў Белград, Маскву і Санкт-Пецярбург.

Самы высокі прахадны бал у эканамічных спецыяльнасцяў на розных факультэтах БНТУ. Тут ён перавышае ўзровень у 300 балаў. Механіка-тэхналагічны факультэт адзначаецца даволі нізкімі баламі — 160-200.

### У модзе выдаўцы і парфумеры

У **Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце** найбольшыя прахадныя балы былі на «выдавецкай справе» — 281 бал і «тэхналогіі тлушчаў, эфірных маслаў і парфумерна-касметычных прадуктаў» — 302/244. Таксама ў фаварытах «фізіка-хімічныя метады і прыборы кантролю якасці прадукцыі» — 279 балаў.

### Ёсць такая прафесія — кіраваць

Каб трапіць у **Акадэмію кіравання пры прэзідэнце Беларусі**, трэба было набраць на 20-30 балаў больш, чым у мінулым годзе. Школа маладых чыноўнікаў мае наступныя прахадныя балы: «дзяржаўнае кіраванне і права» — 282 балы, «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 310 балаў, «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 320/301 для горада і вёскі адпаведна.

### Абаронцы прыроды

Экалогія — адна з найперспектыўнейшых спецыяльнасцяў у свеце. У Беларусі спецыялістаў па гэтым профілі рыхтуе **Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А.Сахарава**. Каб вучыцца ядзернай і радыяцыйнай бяспецы, трэба было набраць 220 балаў. Самы высокі прахадны бал у «медыцынскай экалогіі» і «медыка-біялагічнай справы». Там патрабавалі 253/248 балаў. А вось для «экалагічнага маніторынгу, мэнэджменту і аўдыту» хапіла і 207 балаў.

### Першы погляд на кампанію 2010 года

Імаверна, у наступным годзе вагі хіснуцца ў іншы бок. Міністэрства адукацыі ўскосна зазначыла, што тэставанні гэтага года былі занадта лёгкімі. Значыцца, у 2010 годзе ЦТ паспрабуюць ускладніць. Адпаведна, зменяцца і прахадныя балы — у меншы бок.

Дэмаграфія зноў нагадае пра сябе. Чакаецца недахоп абітурыентаў, ад чаго шмат якія спецыяльнасці могуць застацца ўвогуле без конкурсу. З гэтым будзе звязана і яшчэ праблема — у вышэйшыя навучальныя ўстановы прыйдзецца браць абы-каго.

**Ягор Марціновіч**

# Як палепшыць натуральны адбор?

Як удасканаліць цэнтралізаванае тэставанне?

Тэставанне ці экзамен? Якая праверка ведаў аб'ектыўнейшая? Што трэба зрабіць, каб сістэма праверкі ведаў была максімальна справядлівай і мінімальна залежнай ад выпадковасцяў і блату? Ці добра была арганізавана сёлетняя кампанія тэставання, на якой абітурыенты паказалі нашмат лепшыя вынікі, чым у папярэднім годзе?

Тэставанне па сваёй сутнасці — больш аб'ектыўнае, чым экзамены. З другога боку, у гэтым выпадку важна, якія пытанні задаюцца ў тэстах. На сёння ўсе пытанні і заданні грунтуюцца выключна і літаральна на падручніках. Каб атрымаць 100 балаў, трэба ведаць падручнікі да драбніц, якія могуць падацца неістотнымі чалавеку са здаровым глуздам.

На тэставанні таксама можа пашанцаваць або не пашанцаваць: паколькі варыянтаў тэставання некалькі, то можа трапіцца больш ці менш удалы. З іншага боку, наяўнасць некалькіх варыянтаў заданняў для тэставання зніжае магчымасці для аматараў спісваць.

Хаця для нядобрасумленных ёсць і іншыя магчымасці.

Па-першае, тэсты складаюць людзі, зацвярджаюць людзі, захоўваюць людзі — таму існуе магчымасць «выцекаў інфармацыі».

Па-другое, існуе магчымасць, што той ці іншы абітурыент можа запісацца на тэставанне сама туды, дзе назіральнік — яго знаёмы, і атрымаць дадатковыя шанцы. У Францыі выкладчыкі, якія задзейнічаны у экзаменах як аналагі нашых назіральнікаў, атрымліваюць канверт з указаннем месца, дзе яны будуць працаваць, перад самым тэставаннем, і за час, які застаецца, дабіраюцца да месца працы. Беларусь нашмат меншая за Францыю, і арганізаваць такую працэдуру было б не цяжка. Мэта — выключыць любыя магчымасці пратэкцыі.

Пры падліку агульнага бала ўлічваецца і бал атэстата. З аднаго боку, гэты бал — вынік працы ў школе, і ігнараваць яго было б непавагай да працы настаўнікаў і вучня, з іншага — ці заўсёды ён адпавядае рэальнасці? А бывае, менавіта 1—2 балы розніцы вызначаюць лёс...

У той жа час школьныя педагогі напэўна будуць супраць няўліку бала атэстатаў, бо ў такім разе страцяць важны рычаг уплыву на школьнікаў.

Часам абітурыенты трапляюць у няроўныя умовы яшчэ і праз тое, што назіральнікі ў розных месцах па-рознаму ставяцца да падтрымання дысцыпліны. Для выключэння такіх выпадкаў трэба актыўна выкарыстоўваць кантралюючыя органы, пільнавацца адзіных правілаў.

Не зусім зразумелыя для грамадскасці механізмы праверкі тэставых прац. Правярае камп'ютэр. Але застаюцца пытанні: нават пры сканаванні друкаванага тэксту камп'ютэр дапускае пэўную колькасць памылак. Як жа ён можа расчытаць тэкст, напісаны ад рукі, няхай і друкаванымі літарамі?

І апошняе. Зараз кожны абітурыент мае здаваць толькі 3 тэсты. Гэтая сітуацыя нармальная для тых, хто загадзя выбраў свой напрамак і мэтанакіравана рыхтуецца толькі на пэўную спецыяльнасць. Але для 18-гадовага чалавека гэта не заўсёды проста. Было б больш справядліва даваць магчымасць абітурыентам здаваць столькі іспытаў, колькі яны хочуць (як цяпер робіць у Расіі) — можа, сама гэта дазволіць некаму правільна выбраць жыццёвы шлях.

**Паўліна Купрысь, паспяховая абітурыентка (100+97+94=291 на тэставанні)**

Варта:
– дазволіць здаваць неабмежаваную колькасць прадметаў,
– тасаваць назіральнікаў між рэгіёнамі краіны.

# На платнае навучанне — таксама па конкурсе

Самая дарагая — медыцынская адукацыя.

На самыя прэстыжныя спецыяльнасці цяжка патрапіць нават на платнае навучанне. Гэтак, у БДМУ тыя, хто жадаў вучыцца за грошы бацькоў, прайшлі конкурс прыблізна 2-3 чалавекі на месца. На лячэбным факультэце прахадны бал падрос у параўнанні з мінулым годам на 62 балы (і склаў 273 балы), а на стаматалагічным падрос на 44 балы ( і склаў 257 балаў).

У БДУ многія абітурыенты імкнуцца на спецыяльнасці гуманітарнага факультэта і факультэта міжнародных адносін. Прахадны бал на гэтых факультэтах для платнікаў склаў: на міжнароднае права — 299 балаў, міжнародныя адносіны — 293, лінгвакраіназнаўства — 293, дызайн — 25,5 (з 50 магчымых).

У БНТУ самымі папулярнымі спецыяльнасцямі для платнікаў сталі эканамічныя. На факультэт транспартных камунікацый па спецыяльнасці «эканоміка і арганізацыя вытворчасці» конкурс склаў 2,9 чалавек на месца. Прахадныя балы ў тэхнічным універсітэце на платнае навучанне зашкальвалі да 250.

У БДУІР абітурыенты штурмавалі спецыяльнасць «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», конкурс — 1,6 чалавек на месца. На бясплатнае навучанне па гэтай спецыяльнасці прахадны бал склаў 330, на платнае ён быў 240 балаў.

Для тых, хто конкурс на платнае навучанне прайшоў і нарэшце апынуўся ў шэрагу студэнтаў, цяпер наступіла пара аплаты навучання. Традыцыйна самыя высокія цэны на вышэйшую адукацыю ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. За 2009-2010 год навучання студэнты спецыяльнасці «стаматалогія» будуць плаціць 6 мільёнаў беларускіх рублёў, а студэнты, якія вывучаюць «лячэбную справу» – трохі менш за 5. Кошт адукацыі ў БДУ складае ад 2,5 млн (тэалогія) да 4,7 млн (спецыяльнасці прэстыжнага факультэта міжнародных адносін).

**Настасся Шамрэй**

| Універсітэт-факультэт-спецыяльнасць | Прахадныя балы | | | |
|---|---|---|---|---|
| | агульны конкурс | гарадскі | вясковы | платнае аддзяленне |
| **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** | | | | |
| **Механіка-матэматычны факультэт** | | 288 | 250 | усе ахвотныя |
| **Фізічны факультэт** | 237 | | | усе ахвотныя |
| **Біялагічны факультэт** | | 276 | 259 | 167 |
| **Гістарычны факультэт** | 288 | | | усе ахвотныя |
| **Эканамічны факультэт** | | 334 | 266 | 245 |
| **Філалагічны факультэт** | | | | |
| Расійская філалогія | | 26,7 (з 40) | | усе ахвотныя |
| Беларуская філалогія | | 20,3 (з 40) | | усе ахвотныя |
| **Факультэт філасофіі і сацыяльных навук** | | | | |
| Псіхалогія | | 315 | 311 | 169 |
| Інфармацыя і камунікацыя | 353 | | | усе ахвотныя |
| **Факультэт міжнародных адносін** | | | | |
| Міжнародныя адносіны | 343 | | | 293 |
| Міжнароднае права | | 349 | 341 | 299 |
| Сусветная эканоміка | 357 | | | 276 |
| Лінгвакраіназнаўства | | 344 | 319 | 293 |
| **Гуманітарны факультэт** | | | | |
| Сучасныя замежныя мовы | 312 | | | 184 |
| Дызайн – камунікатыўны дызайн | 41,2 (з 50) | | | 25,5 (з 50) |
| **Інстытут журналістыкі** | | | | |
| Друкаваныя, аўдыявізуальныя, веб-СМІ | | 34,9 з 50 | 33,8 з 50 | усе ахвотныя |
| **Юрыдычны факультэт** | | | | |
| Эканамічнае права | | 297 | 263 | 218 |
| Паліталогія | | 315 | 303 | 192 |
| **Інстытут бізнэса і мэнэджмента тэхналогій** | | | | |
| Бізнэс-адміністраванне | 341 | | | 250 |
| | | | | |
| **Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт** | | | | |
| **Перакладніцкі факультэт** | | | | |
| Англійская мова і другая замежная са спецыялізацыяй | 344 | | | 222 |
| Нямецкая мова і другая замежная са спецыялізацыяй | 342 | | | 148 |
| **Факультэт міжкультурных камунікацый** | | | | |
| Англійская мова і другая замежная са спецыялізацыяй | | 342 | 319 | 245 |
| Нямецкая мова і другая замежная са спецыялізацыяй | 339 | | | 212 |
| **Факультэт англійскай мовы** | | | | |
| Спецыялізацыя «Кампутарная лінгвістыка» | 291 | | | 180 |
| Спецыялізацыя «Расійская мова як замежная» | | 303 | 254 | 192 |
| Спецыялізацыя «Беларуская мова і літаратура» | 279 | | | 193 |
| **Факультэт нямецкай мовы** | | | | |
| Спецыялізацыя «Замежная літаратура, рыторыка» | 258 | | | 167 |
| **Факультэт французскай мовы** | | | | |
| Спецыялізацыя «Замежная літаратура, артафонія, краіназнаўства» | | 258 | 228 | 149 |
| **Факультэт іспанскай мовы** | | | | |
| Спецыялізацыя «Замежная літаратура, краіназнаўства, кампутарная лінгвістыка» (на базе іспанскай мовы) | | 258 | 199 | 155 |
| | | | | |
| **Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт** | | | | |
| Лагапедыя. Спецыяльная псіхалогія | 298 | | | 171 |
| Псіхалогія. Сацыяльная псіхалогія | 296 | | | 168 |
| Фізіка. Матэматыка | | 165 | 163 | 128 |
| Гісторыя. Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны | 271 | | | 153 |
| Беларуская мова і літаратура (4 гады) | 19,3 (з 40) | | | 14,3 (з 40) |
| Расійская мова і літаратура (4 гады) | 23,1 (з 40) | | | 14,7 (з 40) |
| | | | | |
| **Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт** | | | | |
| **Факультэт транспартных камунікацый** | | | | |
| Эканоміка і арганізацыя вытворчасці | | 302 | 278 | 244 |
| Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне | | 224 | 219 | 144 |
| **Машынабудаўнічы факультэт** | | | | |
| Эканоміка і арганізацыя вытворчасці | | 286 | 264 | 204 |
| **Энергетычны факультэт** | | | | |
| Электрычныя станцыі | | 272 | 262 | 162 |
| **Прыборабудаўнічы факультэт** | | | | |
| Мэнэджмэнт | | 292 | 251 | 203 |
| Эканоміка і арганізацыя вытворчасці | | 293 | 277 | 198 |
| | | | | |
| **Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт** | | | | |
| **Лячэбны факультэт** | | 331 | 235 | 273 |
| **Педыятрычны факультэт** | | 309 | 224 | 245 |
| **Стаматалагічны факультэт** | | 359 | 304 | 250 |
| **Медыка-прафілактычны факультэт** | | 286 | 231 | 226 |
| **Вайскова-медыцынскі факультэт** | | 253 | 243 | |
| | | | | |
| **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі** | | | | |
| **Факультэт кампутарных сістэм і сетак** | | | | |
| Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій | 330 | | | 240 |

# У Гродне пара эксперыментавала з порна

**28-гадоваму прадпрымальніку і ягонай партнёрцы пагражае 8 гадоў.**

Гродзенская міліцыя распачала крымінальную справу ў дачыненні да гарадзенца, які на працягу некалькіх месяцаў выкладваў у блог здымкі і відэа парнаграфічнага характару. У галоўнай ролі выступаў ён сам і ягоная сяброўка.

Прычым свой твар гарадзенец старанна хаваў, пакідаючы ўсе «лаўры славы» дзяўчыне. Справа заведзеная паводле часткі 2 арт. 343 КК «Распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў», які прадугледжвае пакаранне да чатырох гадоў турмы.

Паводле слоў дзяўчыны, яны пазнаёміліся гадоў пяць таму. У пэўны момант іх адносіны перасталі быць выключна «сяброўскімі». Прычым палавыя акты, якія адбываліся паміж імі рэгулярна і далёка не заўсёды ў традыцыйнай форме, хлопец прапанаваў здымаць. Так яны і зрабілі.

У дадзены момант дзяўчына адмаўляе сваю датычнасць да злачынства: маўляў, фота і відэа ў блогу на сайце blogspot.com размяшчалася без ейнай згоды. Калі будзе даказана, што яна ў гэтым усё ж удзельнічала, тады ім абодвум пагражае большы тэрмін: за выраб і распаўсюд парнаграфіі групай асоб паводле папярэдняй змовы можна атрымаць да 8 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Цяпер супрацоўнікі гродзенскай міліцыі высвятляюць, з якой мэтай былі размешчаны парнаграфічныя фільмы. Падазраваны будзе адпраўлены на псіхіятрычную экспертызу.

Заканадаўства ў дачыненні да злачынстваў супраць маральнасці жорсткае, што абумоўлена стаўленнем грамадства да гэтага пытання. Лічыцца, што «клубнічка» небяспечная, бо прычыняе шкоду палавой чуллівасці непаўналетніх, акрамя таго, ускосна правакуе злачынствы на палавой глебе. Хаця тут статыстыка якраз супярэчлівая: у краінах, дзе да парнаграфіі ставяцца ліберальна (Данія, Швецыя і Галандыя), самы нізкі ўзровень злачыннасці на сэксуальнай глебе, у той час як у краінах з драконаўскімі законамі гэтыя паказчыкі адны з найвышэйшых.

**ВЖ**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Гэта не кадры з Гродна. Гэта легальны конкурс стрыптызу ў Мінску.**


VOLKOVYSK.BLOGSPOT.COM

# У Ваўкавыску раскапалі сярэднявечныя могілкі

Археолаг Генадзь Семянчук раскапаў могільнік XIII-XV стст. Прычым гарадскі, якіх у Беларусі знойдзена зусім мала.

Экспедыцыя кафедры археалогіі Гродзенскага ўніверсітэта месцам раскопак абрала адзін з пагоркаў побач з Замчышчам. І ўдала.

У невялікім раскопе адкрыта 10 пахаванняў, змешчаных шэрагамі, — расказвае Г.Семянчук. — З іх 7 дзіцячых. Амаль кожнае абазначана камянямі. Усе памерлыя пахаваны галавою на захад, са скрыжаванымі рукамі. Значыць, пахаванні хрысціянскія.

Сярод знаходак — срэбныя скроневыя кольцы XII—XV стст., аскепкі керамікі XI—XIII стст., каменны нацельны крыжык, нож, цвікі.

Яшчэ ўвесну 2001 г. мясцовая жыхарка заўважыла на гэтым пагорку людскія косткі. Яна звярнулася ў ваенкамат. 52-і спецбатальён правodзіў раскопкі. Выявіў 54 шкілеты і перазахаваў на мемарыяльным могільніку «Парахаўня» як салдатаў Другой сусветнай. Толькі пазней удалося высветліць, што пахаванні стаsажытныя, і ўратаваць рэшту іх ад знішчэння.

— Крыўдна, калі за ахвяраў апошняй вайны выдаюцца памерлыя ў XIII-XV стст. А косткі сапраўдных салдатаў 1941-га трушчаць бульдозерамі на будоўлях, — гаруе спадар Семянчук.

**Сяргей Макарэвіч**

# Лошыцкую сядзібу збяруць, як канструктар

**Методыка рэстаўрацыі не парушаецца, запэўнівае старшыня Таварыства аховы помнікаў.**

Маштаб працаў у Лошыцы пачынаеш адчуваць адразу, як трапляеш да Палаца культуры тэкстыльшчыкаў у сталіцы. З'явіліся новыя пабудовы, дарожкі, ляжаць кубы новай пліткі, высяцца гурбы пяску. Паўсюль сляды ад цяжкай тэхнікі. Побач з домам, ад якога на сёння засталася прыблізна трэцяя частка, складзенае ў штабель бярвенне. І гэта рэстаўрацыя?

Старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч у інтэрв'ю БелаПАН запэўніў, што методыка рэстаўрацыі пры правядзенні работ у Лошыцкім парку не парушаецца. «Некаторыя трухлявыя бярвенні драўляных канструкцый сядзібы будуць замененыя на новыя, але гэта методыці рэстаўрацыі не супярэчыць», — заявіў Астаповіч.


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс**

**на сутоках Лошыцы і Свіслачы паўстаў у XVIII—XIX стагоддзях на высокім грэбені над рэкамі. З часам увайшоў у межы Мінска. Вакол мілага палацыка расце ўнікальны парк.**

А ўсе старыя бярвенні па адным збяруць назад. Фундамент будынка таксама будзе разабраны — кожны камень у ім пазначаны нумарам. Нават унікальная кафля з печаў сядзібы адпраўленая на рэстаўрацыю і пазней будзе вернутая на месца.

Маштабная рэканструкцыя Лошыцкага парку сядзібнага дома пачалася ў 2008 годзе. Рэканструкцыяй дома займаецца навукова-вытворчае аб'яднанне «Эльвіра». Скончыць рэканструкцыю згодна планаў яно мусіць у лістападзе 2010 года. Паркавай часткай на замову «Мінскзеленбуда» займаецца ААТ «Будтрэст №1».

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

### Помнік Леніну забіў чалавека

Трагедыя здарылася ў мястэчку Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна. Падзенне помніка стала прычынай гібелі 21-гадовага хлопца раніцай (04:40) 9 жніўня на тэрыторыі мясцовай школы. Хлопец ускараскаўся на пастамент помніка і паспрабаваў павіснуць на працягнутай уперад руцэ правадыра пралетарыяту. Аднак цяжкая канструкцыя абрынулася.

Хлопец ад атрыманых траўмаў сканаў. А ён у тую ноч святкаваў нараджэнне дзіцяці.

### Дзіця ўпала пад кола трактара

У Жабінкаўскім раёне пад коламі трактара загінула пяцігадовае дзіця. Трагедыя здарылася 8 жніўня на прыватным падворку ў вёсцы Старое Сяло.

Гаспадар збіраўся напампаваць запаснае кола свайго «Беларуса» (вышыня кола — больш за 1,5 метра) і прыхіліў яго да трактара. Кола ўпала на дзіця, якое гуляла побач, і прыціснула яго. Хлопчык памёр на месцы.

**БЕЛТА; БелаПАН**

# 26-гадовы футбаліст памёр ад сэрца

Здарылася тое на перадсезонным зборы ў Італіі. Капітан іспанскага «Эспаньёла», абаронца Даніэль Харке,— харошы, імпэтны гулец — быў кумірам фанатаў.

У суботу Даніэль узяў удзел у ранішняй трэніроўцы, але надвячоркам, размаўляючы па тэлефоне са сваёй дзяўчынай, ён нечакана страціў прытомнасць. Дактары «Эспаньёла» спрабавалі выратаваць яму жыццё з дапамогай дэфібрылятара, але марна. Не дапамагла і брыгада «хуткай дапамогі», якая прыехала за лічаныя хвіліны. Праз гадзіну канстатавалі смерць футбаліста.

Дыягназ: сэрцавая недастатковасць. «Эспаньёл» звар'яцеў ад гора», — сказаў дырэктар клуба Херман дэ ла Крус.

Гэта не першы выпадак, калі памірае малады спартовец. Такое здаралася і ў Беларусі. Часам сэрца не вытрымлівае перагрузак, з якімі звязаны вялікі спорт.

Харке дапамог камандзе заваяваць Кубак Іспаніі ў 2006 годзе і дайсці да фіналу Кубка УЕФА ў 2007-м. Перад пачаткам сезона-2009/2010 яго абралі капітанам каманды.



**АГ**

# Унутраная Манголія ў цэнтры Еўропы

**Чыкагскія металісты назвалі свой гурт Minsk «з гістарычных прычын». Як свет адкрывае для сябе Беларусь? Піша Павал Касцюкевіч.**




### Мінск і Minsk

Мы часта наракаем, што ў свеце не ведаюць пра нашу краіну, пра яе гісторыю, культурныя славутасці. А вось для чыкагскага рок-гурта Minsk сталіца Беларусі — крыніца творчага натхнення і мала не легенда. У адрозненне ад брытанскага гурта Belarus, які ў свой час узяў назву досыць выпадкова, амерыканцы зрабілі свой выбар на карысць Мінска свядома.

Minsk **(на фота)** — металічны рок-гурт, які стварыўся ў 2002 годзе. Музыка Minsk'а — гэта жорсткія рыфы, цягучыя мелодыі, у якіх тоісца водгулле рытуальных песняспеваў паганскіх культаў. Самі




**Так бачыць планету Беларусь амерыканская пісьменніца Лі Хоган.**

**«Горад мае жыццяпіс, які поўніць нас натхненнем».**

рокеры характарызуюць сваю музыку як «псіхадэлічны метал». У палітры гуку прысутнічаюць шаманскія бубны, гатычныя клавішы, прапушчаны праз кампутар змрочны вакал. У гучанні ёсць адценні самых розных стыляў, але ўсе іх перадаюць тэрмінам «постметалічная музыка». Нядаўна хлопцы з Minsk'а выпусцілі свой другі альбом With Echoes In The Movement Of Stone («З рэхам у руху камянёў»), станоўча прыняты крытыкамі і шараговымі прыхільнікамі «цяжкача». Як усякі сучасны рок-гурт, яны выпускаюць майкі, на якіх стаіць назва «Мінск».

На пытанне, нашто называцца паводле беларускай сталіцы, лідар гурта Цімаці Мед адказвае: «Збольшага гістарычныя прычыны. Наш гітарыст Кліф Бэнет любіць гісторыю і назва — справа ягоных рук. Горад мае жыццяпіс, які мы палічылі вартым увагі і які поўніць нас натхненнем. Шматлікія акупацыі, разбурэнні і безліч прыкладаў гераічнага супраціву. Мы падумалі, што горад якраз і з'яўляецца сімвалам гэтых усіх рэчаў, а таксама аднаўлення і ўваскрашэння». Што ж да Беларусі, дык чыкагцы лічаць яе нечым накшталт Гіпербарэі: «Нам прыпалі да душы таямнічыя аспекты геаграфічнага становішча Мінска і яго культуры. Для нас, якія жывуць на зямной кулі, там дзе мы жывем, горад падаецца далёкім краем, дзе пануюць халады».

### Планета Беларусь

Чыкагцы не першыя з заходнікаў, хто падняў на шчыт беларускую тэматыку. Малады брытанскі рок-гурт, які параўноўваюць з Radiohead'ам, абраў назву Belarus. Праўда, музыка і тэксты песняў не маюць ніякага дачынення да нашай краіны. Гітарыст Мэт Кілфард кажа, што назву выбралі выпадкова — проста спадабалася слова, Belarus. І толькі пасля шмат чаго цікавага даведаліся пра краіну і яе народ.

У далёкай Арызоне амерыканская пісьменніца Лі Хоган назвала свой фантастычны раман «Беларусь». Дзеянне рамана і яго працягу («Ворагі») адбываецца ў далёкай будучыні на планеце, якая носіць назву Беларусь. Галоўны герой, Андрэй Міроненка, стварае там пасяленца і абвяшчае сябе царом, маючы на мэце зрабіць з Беларусі ідэальную, няспраўджаную на Зямлі, Русь. Хоць сапраўдная Расійская імперыя даўно знікла, на планеце Беларусь ажывае яе сімвал: неавізантыйскі стыль (хай-тэкаўскія хмарачосы з макаўкамі), а яе арыстакратыя абазнаная ў суплётах расійскай гісторыі. У футурыстычнай Беларусі побач з нанатэхналогіямі і зоркалётамі ажывае славянская міфалогія ў асобе ведзьмакоў і Бабы-Ягі, галоўнага прарока планеты. У канцэпцыі яўна адбіўся стэрэатып, які паўстае, калі заходнікі даслоўна перакладаюць назву нашай краіны. Маўляў, нейкая зямля, населеная «белымі рускімі».

### Усходнееўрапейская Гіпербарэя

Што ж вабіць у назве нашай краіны замежных творцаў? Як яны бачаць Беларусь? Паспрабуем падсумаваць. Па-першае, прынамсі для англійскага вуха слова Belarus проста мілагучнае. Па-другое, Беларусь для іх — гэта трошкі Расія і ўсё што з ёй звязана: неймаверныя сібірскія халады і расійскае бязмежжа (ва ўсіх сэнсах). Па-трэцяе, Беларусь — краіна, без сумневу, таямнічая, кшталту містычнай Унутранай Манголіі, дзе рэчаіснасць перапляценая са старажытнымі міфамі і магіяй; або легендарнай краіны Гіпербарэі, месца жыцця дабрашчаснага старажытнага народа. Нязнаны край, можа быць, загадкавейшы за больш зведаную Расію.

Саліст гурту Minsk назваў беларускую сталіцу халодным горадам, дарма што ў ягоным родным Чыкага не нашмат цяплей. Хоць мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы, але нас усё ж называюць «далёкім краем». Нястача ведаў пра Беларусь нараджае таямніцу, а таямніцы, як вядома, натхняюць.

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Deviation




Чарговы дзень пад акупацыяй, самвыдат, 2009

**Гэта рык, што жыве Беларусь.**

Лібералізацыя не пройдзе. Гродзенскія анархісты дэманструюць смачны фак дзяржаўнаму ладу ў выглядзе свайго новага альбома. Думалася, што Deviation засталіся ў сумбурных 1990-х, калі пайшлі першыя палітычныя суды, паўсталі нацыяналістычныя арганізацыі, актывізаваўся анархісцкі рух, на вулічныя акцыі выходзілі дзесяткі тысяч... і падавалася, нешта можа вось-вось змяніцца. Суцішыліся хваляванні, радыкалы пасталелі ды завялі сем'і, на іх месца прыйшлі больш памяркоўныя. Але курылка Deviation жыве, хоць і маўчаў сем гадоў. Во такога не хапала ў беларускім андэграўндзе: у пысу жорсткім словам ды брудным акордам: «Бунтуй! Давай! Крычы! Трывай! За...бала!!!».

«Чарговы дзень пад акупацыяй» — гэта рык, што жыве Беларусь. Без пафасу, без лішняй вобразнасці, гарачым жалезам яны выпальваюць комплексы непаўнавартасці ды правінцыйнасці. Пяецца проста: «Мы будзем жыць, калі Лука здохне». Вельмі моцныя нумары — «Будучым ворагам», «Сэкс з прэзідэнтам», ніштаваты кавэр на Барзыкіна «Твой бацька — фашыст».

Вельмі няроўны, правакацыйны, душэўны, грубы і шчыры альбом падарылі нам гродзенцы.

### Наталля Арсеннева




З крывіцкай сям'і, БМА-груп, 2009

**Галоўная музычная прыемнасць — «Храм незямны» ад «Голай манашкі».**

Складанка-прысвячэнне ад беларускіх выканаўцаў да 85-годдзя паэткі-эмігранткі. Задума ўшаноўваць такім чынам тых, чые творы з невялікай ахвотай вяртаюцца сёння з забыцця — супергодная. Дагэтуль не менш удалымі былі музычныя праекты з гэтай жа серыі на вершы Геніюш і Новіка-Пеюна. Усе яны характарызуюцца разнастылёвасцю — па калііўцу з кожнага кірунку. Паэзію Арсеньневай спяваюць бард Таня Беланогая, адэпты электра-попу Zigzag, салістка дзяржаўнай філармоніі Таццяна Матафонава, хард-рокеры з «In search for»... Не стае хіба эстраднай прадстаўнічасці. Во каб Шаркунова што-небудзь з Арсенневай заспявала!

Падкупляе лёгкая па настроі, простая па аранжыроўцы і па-добраму наіўная «Я ішла» ад Алесі Унукоўскай. Музычны антыпод ёй — цяжкая, як сон у душную летнюю ноч, песня на той жа верш ад гурта «Рострa» з вельмі доўгім і прыгожым адступленнем у стылі французскай «Air». Самая ж галоўная музычная прыемнасць — «Храм незямны» ад «Голай манашкі». Як і ў выпадку з «Павязаным» на верш Новіка-Пеюна, Федзя зліўся з чужым тэкстам і зрабіў яго сваім. Таго не скажаш пра адзіную правальную песню з дыска — «Шчасце» Уладзіміра Зайчанкі, запісаную ў найгоршых традыцыях ВІА 1980-х.

Хацелася б працягу праекта — на вершы Жылкі, Сыса, Кляшторнага, ды і спевы на Караткевіча ды Багдановіча з Купалам варта ўпарадкаваць урэшце.

### Іван Буслай



Достучаться до небес, Спамаш, 2009

**У нас з'явіўся «сын Усходу».**

Дэбютнік хлопчыка з першымі прыкметамі мужчынскасці і з такім сумным позіркам — прадукт ад прадусарскага ўтварэння «Спамаш», якое ўзялося за стварэнне другога эшалона беларускай эстрады. Як вы яхту назавеце — так яна і паплыве. Інакш як музычным спамам такую прадукцыю не назавеш. Цяпер у нас з'явіўся яшчэ і «сын Усходу». Песенькі Івану напісалі з такім каларытам, пад Араша: «Странная-странная, такая иностранная», — на абсалютным сур'ёзе выдае спявак адзін з «хітоў лета» (так напісана на вокладцы). З некалькіх больш-менш уцямных рэчаў, што тут прапануюцца, — «Судьба» з Афанасьевай ды дзве англамоўныя песні «Butterfly» ды «Supersensual love».

**Сяргей Будкін**




# III. Калейдаскоп культур. Праваобраз Літвы. Загадкавыя крывічы

Раздзелы з новай кнігі гісторыка **Алега Дзярновіча** на старонках «НН». Працяг. Пачатак у №26.

## Калейдаскоп культур

У перыяд да пашырэння на тэрыторыі Беларусі пісьмовасці нам прыходзіцца выкарыстоўваць паняцце «археалагічная культура» — гэты тэрмін быў уведзены яшчэ ў канцы 1920-х аўстралійскім філолагам і археолагам Вірам Горданам Чайлдам для пазначэння сукупнасці археалагічных помнікаў, што знаходзяцца на адной тэрыторыі і маюць шэраг агульных рыс, якія іх і аб'ядноўваюць. Звычайна археалагічнай культуры даюць назву паводле нейкай характэрнай прыкметы, якая адрознівае яе ад іншых культур.

За нейтральнымі назвамі археалагічных культур часта хаваецца асцярожнасць гісторыкаў. Складана даваць этнічныя характарыстыкі супольнасцям, якія пакінулі нам гэтак званыя «археалагічныя культуры». У рымскі час мы шукаем паведамленні антычных аўтараў пра нашы землі, каб неяк супаставіць гэтыя агульныя і блытаныя звесткі з тым ці іншым насельніцтвам (культурай) на тэрыторыі Беларусі. Карыстаемся і рэтраспектыўным метадам, калі прасочваем сувязь той ці іншай «археалагічнай культуры» з ужо вядомым нам паводле пісьмовых крыніц пазнейшым насельніцтвам. Падобныя метады пакідаюць прастору для бясконцых дыскусій. Але ж мы не можам зусім абстрактна казаць пра людзей, якія насялялі Беларусь і не спрабаваць хоць неяк акрэсліць іх паходжанне, а таксама ўплыў на пазнейшых насельнікаў.

Пры ўсёй кампактнасці нашай краіны этнакультурныя працэсы на яе тэрыторыі адбываліся нераўнамерна. У Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі праз усю эпоху жалеза не назіралася асаблівых радыкальных змен. Гэта былі тэрыторыі, стабільна занятыя балтамі, энергія якіх скіроўвалася на ўнутраную каланізацыю. Наадварот, на поўдні Беларусі ішлі дынамічныя працэсы. Сюды з поўначы Еўропы спускаліся готы, нашы паўднёвыя абшары былі закранутыя Вялікім перасяленнем народаў, таксама на Палессі раней за іншыя рэгіёны Беларусі распачаліся працэсы славянізацыі.

Значныя змены ў жыцці насельніцтва Беларусі адбыліся ў сярэдзіне I тыс. н. э. Спынілі існаванне помнікі ўсходнебалцкіх культур (Днепрадзвінскай і Штрыхаванай керамікі), спрэчнай Кіеўскай культуры (магчыма, з удзелам як балтаў, так і славян), а таксама усходнегерманская / гоцкая (Вельбарская культура). На ўзроўні археалагічнага матэрыялу мы можам прасачыць фармаванне ўжо больш блізкіх да нас супольнасцяў.

Выявім асцярожнасць і падсумуем, што нам вядома пра тыя «археалагічныя культуры», якія склаліся на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне — другой палове I тыс. н. э. — напярэдадні ўзнікнення дзяржаўнасці. Гэтыя культуры маюць яшчэ для нас тую актуальнасць, што вызначаюць этнічную і палітычную гісторыю Беларусі практычна да XIII ст.

## Праваобраз Літвы

Ад рубяжа IV—V стст. насельніцтва не толькі Паўднёвай, але і Паўночнай, і Цэнтральнай Беларусі стала адчуваць на сабе міграцыйныя хвалі. З захаду (з паўночнага ўсходу Польшчы), у абшары ўсходніх балтаў (продкаў літоўцаў, латышоў і таксама беларусаў) патрапілі балты заходнія (прусы—яцвягі). Пад уздзеяннем, падобна, больш развітых на той момант заходніх балтаў кансерватыўныя супольнасці ўсходніх атрымалі імпульс да развіцця. Усходнія балты засядзеліся ў сваіх лясах і ім была трэба новая дынаміка, якую прыўнеслі заходнія суродзічы.

Так утварылася Культура ўсходнелітоўскіх курганоў, якую ўжо па пазнейшых пісьмовых крыніцах можна атаясамліваць з «гістарычнай Літвой». Экстравертныя імпульсы з гэтай часткі нашага краю і прывядуць у сярэдзіне XIII ст. да ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.



Крывічанка. Рэканструкцыя твару па чэрапе.

ІЛЮСТРАЦЫІ ПАВОДЛЕ КНІГІ У. АРЛОВА І З. ГЕРАСІМОВІЧА «КРАІНА БЕЛАРУСЬ»



Пацеркі пачатку XI ст. з крывіцкага курганнага могільніка каля в. Ізбішча на Лагойшчыне.



Грабяні з рогу.

## Загадкавыя крывічы

Зусім не простая гістарычная праблема — паходжанне і этнічная прыналежнасць крывічоў. Нарматыўна іх залічваюць да славян, што рабіў і стваральнік канцэпцыі балцкага субстрату беларусаў маскоўскі археолаг Валянцін Сядоў. Але як археалагічныя, так і пісьмовыя звесткі сведчаць на карысць больш складанай гісторыі ўладароў поўначы нашага краю на мяжы тысячагоддзяў.

Крывічы пакінулі свае пахавальныя помнікі — гэтак званыя «доўгія курганы». Народная назва іх — «валатоўкі». Іх даўжыня сапраўды можа дасягаць 110 м.

Часам наступнага нябожчыка ці яго спалены прах клалі зусім побач з ранейшымі пахаваннямі, не насыпаючы новы курган, а працягваючы ранейшы. Такім чынам, чым даўжэйшы курган — тым большы перыяд часу мінуў між жыццём першага і апошняга пахаванага ў ім. Археолагі часам дзівяцца, наколькі змяняецца генатып за некалькі пакаленняў, знаходзячы ў пачатку кургана камлюкаватых круглагаловых людзей, а пры канцы — высокіх доўгагаловых.

Сёння археолагі пішуць пра сляды міграцыі насельніцтва, якое пакінула доўгія курганы. Гэты шлях вызначаецца, у тым ліку, праз так званыя В-падобныя рыфлёныя спражкі, пашыраныя ад германскіх культур у Цэнтральнай Еўропе, праз заходніх балтаў да крывіцкай Пскоўшчыны.

Міграцыя крывічоў увесь час адбывалася праз балцкія тэрыторыі, і гэта ўжо насцярожвала даследчыкаў — тут папросту няма прыкмет славянскасці. Антрапалагічна крывічы выявіліся не проста падобнымі, а тоеснымі з латгаламі (насельнікамі Усходняй Латвіі). Гідранімія (назвы водных аб'ектаў) крывіцкай тэрыторыі — бясспрэчна балцкая.

Беларускі археолаг Аляксандр Мядзведзеў цяпер наўпрост піша, што крывічы — гэта балты. Буйнейшы знаўца крывіцкіх старажытнасцяў Георгій Штыхаў адносіць крывічоў да ўсходніх славян, але якія маюць у сваім радаводзе балцкі кампанент. Штыхаў адзначае, што адносіны паміж славянамі і балтамі не былі адназначнымі. Мела месца мірнае суіснаванне, ваенныя сутыкненні, асіміляцыйныя працэсы. Прычым асімілявалі не толькі славяне балтаў, але ў шэрагу выпадкаў славяне былі асіміляваныя балтамі.

Трэба нагадаць, што «Аповесць мінулых часоў» сярод «славенскіх моў Русі» не называе крывічоў. Але палачане — частка крывічоў — для старажытнарускіх летапісцаў — гэта славяне. У сярэдзіне XII ст. крывічы знікаюць са старонак летапісаў.

Усё ж ранніх крывічоў паводле аб'ектыўных прыкмет мы можам аднесці менавіта да балтаў. З узнікненнем у IX ст. сталых умацаваных населеных пунктаў славян (Полацка, Віцебска, Лукомля) ініцыятыва канчаткова перайшла да гэтых таксама нядаўніх мігрантаў. Моваю гарадскіх крывічоў — палачанаў — стала славянская. Парадаксальным чынам да падобных моўных трансфармацый і пераўтварэння крывічоў нашага краю ў палачан спрычыніліся скандынаўскія пасяленцы і новая варажска-руская эліта.

**Алег Дзярновіч**

| Рэгіён | Назва культуры | Час існавання | Этнічная інтэрпрэтацыя |
|---|---|---|---|
| Паўночная і Цэнтральная Беларусь | Банцараўская культура | V—VIII стст. | Поліэтнічнае насельніцтва (балцкае з прысутнасцю славянскага кампанента) |
| Паўночна-Заходняя Беларусь і сучасная Усходняя Літва (гістарычная Віленшчына) | Культура ўсходнелітоўскіх курганоў | IV—XII стст. | Усходнебалцкае насельніцтва |
| Сярэдняе Панямонне | Культура каменных курганоў і каменных магіл | V—XIII стст. | Заходнебалцкае насельніцтва (яцвягі) |
| Паўночная Беларусь | Доўгіх курганоў (смаленска-полацкіх) | VIII—X стст. | Крывічы (поліэтнічнае насельніцтва з балцкімі і славянскімі кампанентамі) |
| Паўднёва-Заходняя Беларусь (Заходняе Палессе) | Пражская культура | V—VII стст. | Славянская |
| Паўднёва-Усходняя Беларусь (Сярэдняе Падняпроўе) | Калочынская культура | V—VII стст. | Славянская |
| Паўднёва-Заходняя Беларусь (Заходняе Палессе) | Лука-райкавецкая культура | VIII—X стст. | Славянская |
| Паўднёва-Усходняя Беларусь (частка Сярэдняга Падняпроўя) | Роменская культура | VIII—X стст. | Славянская |

Пра бурлівыя працэсы на поўдні Беларусі і трансфармацыі крывічоў на поўначы краю чытайце ў наступных выпусках аўтарскай «Гісторыі Беларусі» Алега Дзярновіча.

# Мястэчкі над азёрамі

Дунілавічы—Лучай—Паставы. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Пастаўшчына, што цяпер ляжыць на ўскрайку зямлі беларускай, калісь ляжала на галоўнай дарозе краіны — з Полацка ў Вільню. Па асноўным шляху, што нітуе цяперашнюю Літву, колішнюю Прусію, Беларусь і Расію.

### Кавярня ў Навасёлках

Пад Навасёлкамі пры дарозе ёсцека кавярня. Рэдкасць пакуль у азёрным краі. Тамака ж славутая на ўсю краіну страўсавая ферма. Хто прыдумае лепшы спосаб прыцягнуць увагу да прыдарожнай карчмы? У гаспадарцы «Навасёлкі—Лучай» страўсы добра адаптаваліся да нашага клімату. Ёсць там таксама плямістыя алені, парсючкі, бычкі, козы, трусы, коні... Да ўсяго, тут вырабляюць муку і хлеб, каўбасы і пяльмені, масла і сыр, пітную ваду і квас. І нават маюць невялікі асфальтавы заводзік. Лагічна, калі гаспадарыш пры вялікай шашы.

### Унікальны аўтар

Калі ж збочыць з магістралі, на крыжоўцы старых дарог убачыце Дунілавічы. Невялікае мястэчка з каларытнымі габрэйскімі камяніцамі, тузінам старасвецкіх крамак і шыкоўным Траецкім касцёлам дамініканцаў. У касцёле захоўваецца цудатворны абраз Маці Божай Ларэтанскай, што трапіў да нас у XVII ст. з Фларэнцыі. Таксама ў касцёле варта звярнуць увагу на ўнікальны двух'ярусны ступеньчаты алтар. Такіх болей у краіне няма. Дый сам гэты велічны храм — адзін з найцікавейшых помнікаў архітэктуры барока ў Беларусі. А адразу за старасвецкімі яўрэйскімі могілкамі пачынаецца дарога на Лучай... Роўная, нібы страла, у засені высокіх старых дрэваў.

### Сцэны з жыцця XVII ст.

Мястэчка над маляўнічым возерам Лучайскім перахавала крыху старасвецкага каларыту ў старых мураванках, руінах панскага двара, плябаніі, дзе месціцца базавая школка.

Ужо здалёк над Лучаём відаць касцёльныя вежы. Яшчэ адзін шэдэўр архітэктуры, варты здзіўлення. Сваімі памерамі касцёл Святога Юды Тадэвуша пераўзыходзіць храмы ў сталіцах. Зайдзіце ўсярэдзіну, як будзеце мець час. Сцены і скляпенні велічнай базілікі распісаныя фрэскамі ў тэхніцы «грызайль», што імітуе архітэктуру і скульптурную лепку. Сярод святых і анёлаў тут можна гадзіну разглядаць сцэны з жыцця Лучая XVIII стагоддзя: шляхта і сяляне, ксяндзы і паненкі, дамы і кавалеры... Многія вобразы, бачна, пісаныя з канкрэтных сучаснікаў мастака...

А перад касцёлам стаіць першы ў свеце помнік Папу Бенедыкту XVI. Са званіцы над азёрнымі разлогамі далёка чуваць гукі класічнае музыкі...



**Пастаўскія камяніцы.**

### Будучы Лас-Вегас

Ад Паставаў 165 кіламетраў да Мінска і столькі ж — да Вільні. Машыны з літоўскімі, латвійскімі і польскімі нумарамі, фуры — адусюль. Тут працуе вялікі льнозавод, малаказавод, мясакабінат. Быць у Паставах і не зайсці ў іх фірмовыя крамы, не закупіцца сырамі, кілбасамі і льнянымі рэчамі — няслушна. Бо тут гэта ўсё якаснае.

На плошчы ж варта зайсці ў багата аздобленую Свята-Мікалаеўскую царкву. Да царквы прыставілі блакітныя сталічныя елкі, а да іх — Леніна. Гэта наймаладзейшы ў Беларусі (а мо і ва ўсім свеце) помнік Леніну — ён быў узведзены ў 1992(!) годзе. Нядаўна вакол бронзавае фігуры размясцілі пальмы. Такога болей нідзе не ўбачыш. Бетонная плітка, шклопакеты, пальмы, залатыя купалы і бронзавы Ільіч. На малінава-памаранчавым заходзе сонца, у зіхоткім ліловым святле азёр і ставоў адбіваюцца купалы і штучныя пальмы... Сталіца Заходняга Паазер'я можа прэтэндаваць у будучым на званне беларускага Лас-Вегаса. Прынамсі, гульнёвыя аўтаматы тут ужо стаяць і казіно працуе.

Разам з тым Паставы — адзін з гарадоў Беларусі, у якім некаранёны культурны асяродак стварае ўнікальныя духоўныя каштоўнасці. Тут пішуцца вершы і ствараюцца творы мастацтва. Тут выдаецца незалежны часопіс, ладзяцца краязнаўчыя чытанні. Тут працуе краязнаўчы музей, два дамы культуры, чатыры бібліятэкі, кінатэатр, ладзіцца штогод фэст народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».

Некалі ўласнік Паставаў Антоні Тызенгаўз пабудаваў тут сапраўдны еўрапейскі горад. Паўтузіна тызенгаўзаўскіх мураванак XVIII ст. дастаяла да нашых дзён. Нават аптэка засталася, што не зачынялася на працягу двух стагоддзяў! Аднавілі старасвецкія каналы і спарадкавалі парк, паднавілі і палацавы комплекс Тызенгаўзаў. Парк з палацам, дзе цяпер бальніца, адкрыты для ўсіх.

Гонар Паставаў — неагатычны касцёл Святога Антонія Падуанскага. Касцёльны гадзіннік з вежы звонам нагадвае вернікам, што праз паўгадзіны пачнецца імша. Мелодыю гадзінніка можна пачуць з любога кутка Паставаў.

Пры касцёле, дарэчы, ёсць музей гісторыі рэлігіі, у калекцыі якога ёсць рэдкія прадметы. Сярод іх — даранасіца, выробленая ў 1663 годзе, ксяндзоўскі арнат, пашыты ў 1860 годзе. А на плошчы Леніна варта зайсці і ў Пастаўскі раённы краязнаўчы музей. Чаго тут толькі няма — можна пабачыць творы тутэйшых народных майстроў ад неаліту да нашых дзён.

Адпачыць, пакупацца ў азёрах ці парыбаліць, пад'есці і пабавіць час у Паставах не праблема. Спыніцца можна ў вельмі прыстойнай гасцініцы альбо скарыстацца сэрвісам Дома паляўнічага.

### Касцёл-«абсерваторыя»

А за Паставамі ўжо недалёка і Камаі. Некалі слыннае мястэчка над уласнымі, як тут паўсюль, азёрамі — Камайскімі. У дзівосным камайскім касцёле Яна Хрысціцеля дзейнічае адзін з найстарэйшых арганаў у Беларусі.

Касцёл, што болей падобны да нейкай абсерваторыі, стаіць пасярод мястэчка на высокім узгорку. У таўшчэзных, двухметровых мурах захраслі каменныя ядры. Яны засталіся як напамін пра абстрэл касцёла шведамі ў часе Паўночнай вайны. Касцёл распісваў выдатны тутэйшы мастак з маёнтка Каралінова Альфрэд Ромер. Тут жа, у храме, знаходзіцца і яго палатно «Хрыстос і сірата».

Перад касцёлам на былой местачковай плошчы ўкапаны стаNone ражытны каменны крыж, невядома кім і калі пастаўлены... Вяртацца ў Мінск з Камаёў можна праз Нарачанскі край. А гэта ўжо іншая гісторыя...

**Касцёл Яна Хрысціцеля**

пабудаваны ў Камаях у 1603—1606 на сродкі Яна Рудаміны-Дусяцкага. Помнік абарончa-культавага дойлідства з рысамі і готыкі, і рэнесансу, і барока. З заходу храм мае дзве вялікія магутныя цыліндрычныя вежы з ярусамі паўкруглых байніц, што абаранялі ўваход у касцёл. Збераглiся арганы XVII—XVIII стст., аздобленыя разьбой і скульптурай, а таксама чатыры драўляныя алтары. У цэнтры знаходзіцца алтарны цудадзейны абраз Маці Божай. У сутарэннях ёсць шматлікія старасвецкія пахаванні.



**Камаі**

ў пісьмовых крыніцах згадваюцца ад пачатку XVI ст. У 1915 тут пачаў свой святарскі шлях Казімір Сваяк. У Камаях нарадзіўся і арганіст-віртуоз, заснавальнік сусветных фэстаў арганнае музыкі Браніслаў Рудкоўскі.




**Касцёл Святога Юды Тадэвуша**

Будаваўся ў 1766—1777 на грошы Агінскіх, якім і належаў маёнтак Лучай. Мае рысы і барока, і класіцызму. Зала перакрытая цыліндрычным скляпеннем. Сцены і скляпенні пакрытыя фрэскамі ў тэхніцы «грызайль», што імітуе архітэктуру і скульптурную лепку.



**Сцэны з мясцовага жыцця XVII стагоддзя на роспісах касцёла ў Лучаі.**



# Вялікі Варшаўскі цырк

У Мінск прыязджае Вялікі Варшаўскі цырк. Гастролі адбудуцца на пляцоўцы цырка-шапіто, непадалёк ад Нацыянальнай бібліятэкі. У праграме — дрэсіраваныя сланы і вярблюды, коні і аслы, поні і сабакі. **Пачатак прадстаўленняў а 15-й і 19-й.**

## ФЭСТЫ

**«Навальніца» феерверкаў**

**28 — 30 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск»** пройдзе першы міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца». Выступы еўрапейскіх піратэхнічных камандаў падтрымаюць музыкай гурты **«J:морс»**, **«Ляпіс Трубяцкі»**, **«Палац»**, а таксама дыджэі. Да пляцоўкі фестывалю можна дабірацца асабістым транспартам або на спецыяльным аўтобусе, які будзе курсаваць да фестывальнай пляцоўкі ад ст.м. «Усход».

**«Hard-Fest» у парку «Dreamland»**

**22 жніўня** усіх аматараў добрай музыкі збірае **забаўляльны парк Dreamland (вул.Арлоўская, 80)**, на тэрыторыі якога адбудзецца вялікі фестываль «Hard-Fest». Для вас у гэты дзень адразу на дзвюх музычных пляцоўках будуць граць найлепшыя айчынныя рок- і метал-гурты. Бясплатныя атракцыёны і пазітыўны настрой уключаныя ў кошт квітка.



**Фестываль аўтарскай песні ў Рагачове**

**22-23 жніўня ў Рагачове** адбудзецца фестываль аўтарскай песні. Бяруць удзел творчыя асобы і гурты, якія працуюць у жанры аўтарскай песні.

## ІМПРЭЗЫ

**Алег Латышонак у Віцебску, Вілейцы, Полацку і Бешанковічах**

**20 жніўня ў Віцебску** будуць прэзентаваныя полацкі нумар часопіса ARCHE з удзелам Уладзіміра Арлова, Валера Булгакава і новая кніга Алега Латышонка «Нацыянальнасць — беларус». **Пачатак а 18-й. 21 жніўня** прэзентацыя кнігі Алега Латышонка «Нацыянальнасць — беларус» з удзелам аўтара пройдзе **ў Вілейцы**. **Пачатак у 18.30. 22 жніўня а 16-й** з Алегам Латышонкам можна будзе сустрэцца ў Музеі беларускага кнігадрукавання ў Полацку. Запланаваная таксама прэзентацыя полацкага нумару ARCHE і кнігі Алега Латышонка ў Бешанковічах з удзелам аўтара. Усе прэзентацыі адбудуцца ў рамках кампаніі «Будзьма». Даведкі па т.: (029) 550-79-69.

**Някляеў і Кустава ў Нясвіжы**

Літаратурная сустрэча з пісьменнікам Уладзімірам Някляевым і паэткай Валярынай Куставай пройдзе **ў г. Нясвіжы 19 жніўня**. Сустрэча мае адбыцца **ў Цэнтральнай бібліятэцы Нясвіжа, якая знаходзіцца па адрасе: вул. Савецкая, 34. Імпрэза распачнецца а 13-й.**

**Каранацыя абраза Маці Божай Валадаркі Азёраў**

**22 жніўня ў Браславе** адбудзецца каранацыя абраза Маці Божай Валадаркі Азёраў. Абраз стане першым каранаваным у Віцебскай вобласці і сёмым — у Беларусі. Да гэтага кароны былі ўскладзены на шэсць абразоў: Маці Божай Берасцейскай (1996 г.), Маці Божай Лагішынскай (1997 г.), Маці Божай Будслаўскай (1998 г.), Маці Божай Кангрэгацкай у Фарным гродзенскім касцёле (2005 г.), Маці Божай Гудагайскай (2007 г.), Маці Божай Тракельскай (2009 г.).

## ВЫСТАВЫ

**Фестываль мастацтваў «ДАХ-9»**

Міжнародны фестываль мастацтваў «ДАХ-9» пройдзе **з 25 жніўня да 20 верасня ў Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3)**. На адной пляцоўцы будуць суіснаваць жывапіс і скульптура, фатаграфія і перформанс, літаратура і музыка, тэатральнае мастацтва і кіно, стрыт- і відэа-арт. У межах фестывалю будуць прадстаўленыя персанальныя і супольныя праекты беларускіх аўтараў, а таксама работы іх калег з Германіі, Нарвегіі, Італіі, Польшчы, Украіны, Расіі, Нідэрландаў, Японіі, ЗША і Ізраіля.

**Фотавыстава Дарашкевіч і Грыца**

Фотавыстава «Беларусь: час і месца» беларускіх фотарэпарцёраў Сяргея Грыца і Юліі Дарашкевіч працуе **ў Вільні ў памяшканні канферэнцзалы Музея ахвяраў генацыду (вул. Аўку, 2а)**. Выстава працягнецца **да 27 жніўня**.

**Беларусь XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі (вул.Маркса, 12) да 31 снежня** працуе выстава «Беларусь XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы». На выставе можна ўбачыць таксама строі, выкананыя сучаснымі мастакамі па касцюме і вышыўцы — тры дамскіх туалеты ў стылістыцы магнацкіх касцюмаў XVI—XVIII стст.

**Студэнцкія вакацыі**

**У мастацкай галерэі «АртБлік» (вул.Някрасава, 11) да 15 жніўня** працуе выстава «АртБлік», на якой можна ўбачыць справаздачы студэнтаў мастацкіх вучэльняў аб пачатку творчых вакацый: арыгінальныя нацюрморты, інтэр'ерныя замалёўкі і фігуратыўныя кампазіцыі.

**Узяць пад казырок**

**У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав.Музычны, 5) да 28 жніўня** працуе выстава «Узяць пад казырок…» У экспазіцыі — фуражкі, барэты, пілоткі, бесказыркі, бейсболкі і капелюшы … Найбольшую цікавасць выклікаюць галаўныя ўборы з чорнымі пеўневымі пёрамі італьянскіх берсальераў, а таксама футравыя шапкі англійскіх каралеўскіх гвардзейцаў, амуніцыя індыйскага паліцэйскага і парадная фуражка ваеннаслужачага французскага замежнага легіёна. Асаблівае месца на выставе адведзена гісторыі формы беларускай міліцыі.

## ТЭАТРЫ

**13 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**14 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**15 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

**16 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**18 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»

**19 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Несапраўдны хворы»

**20 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»

**21 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**22 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Нінечка»

**23 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»



**Be Free-2009**

**22 — 23 жніўня ў Чарнігаве (Украіна)** адбудзецца Міжнародны музычны фестываль Be Free, на які запрошаныя 20 маладых і вядомых гуртоў з Беларусі, Украіны, Польшчы і Францыі. Хэдлайнерамі гэтага года будуць гурты **«Ляпіс Трубяцкі»** (Беларусь) і **«Воплі Відаплясава»** (Украіна), да якіх далучацца госці з Польшчы (**Zero-85**) і Францыі (**Vladivostok**), а таксама беларускія гурты **B:N**, **Zatochka**, **Tarpach**, **Partyzon**, **Pomidor/OFF**, **LitvinTroll**, **Imprudence**, **ULIS** і інш.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Кідок кобры

Беспрынцыпны шатландскі гандляр зброяй пагражае чалавецтву. Але чалавецтву пашанцавала: на яго абарону становіцца сакрэтны атрад змагароў…

«Кідок кобры» — высокабюджэтны трэш ад Стывена Сомэрза, перанасычаны штампамі. Процьма неахайна зробленых спецэфектаў, бязглуздая страляніна, інтрыга, падабраная на галівудскай сметніцы. Фірмовы гумар, які калісьці дэманстраваў Сомэрз на «Муміі», забыты. «Змяіная» стужка стэрыльная, як пластыкавыя жаўнерыкі, рэкламай якіх і з'яўляецца фільм.

Але ў гэтай цяжкай сітуацыі ёсць некалькі стратэгій, якія дазваляюць гледачу адчуць асалоду ад самай пустой гульні.

Першая стратэгія — адгадваць, дзе і што скрадзена з іншых фільмаў. «Кідок кобры» дае для гэтай забаўкі процьму магчымасцяў. Тут вам і «Зоркавыя войны», і Джэймс Бонд, і капітан Нэма, і «Пяты элемент», і… — карацей, самі шукайце.

Другая забаўка — дакручваць тупыя патрыятычныя фразы да поўнага імбецылу. Уявіць, што яны вымаўляюцца не з гонарам, а з іроніяй. І дадатковая асалода — лавіць рэжысёра на парушэннях законаў фізікі (прыемна адчуваць сябе разумным-разумным).

Наступную стратэгію можна параіць усім, хто асмеліцца паглядзець фільм на DVD. Можна адключыць гук — і заняцца альтэрнатыўнай агучкай; можна дзеля сюррэалізму павярнуць тэлевізар набок.

Але самая рызыкоўная стратэгія, за якую могуць і морду набіць, такая. Усе гэтыя баранэсы ў латэксе, пластыкавыя пехацінцы, гандляры ў жалезнай масцы, ніндзі і гнюсныя навукоўцы — насамрэч, вядомыя медыйныя персанажы. Засталося толькі на пачатку фільма раздаць ім імёны. Шурык, Стасік, Ліда, Вова і — страшна падумаць — Зянон Станіслававіч.

Выбуховы эфект — гарантуецца.

**Андрэй Расінскі**




**Кідок кобры** (G.I. Joe: The Rise of Cobra)

ЗША, 2009, каляровы, 107 хв.

**Рэжысёр:** Стывен Сомэрз

**Ролі выконваюць:** Чэнінг Татум, Сіена Мілер, Марлон Уэйэнз, Арнольд Вослу, Крыстафэр Эклстан, Джозэф Гордан-Левіт

**Жанр:** Фантастычны баявік

**Адзнака:** 4,5 (з 10)



У гадзіны пік гарадскія аўтобусы набіваюцца пад завязку.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Тайна маршрутных «душагубак»

**У пакутах пасажыраў вінаватыя вузкія фортачкі і нядбайныя кіроўцы.**

На тым тыдні байнэт шакавала навіна: на вуліцы Маякоўскага некалькі гадзін праляжаў труп чалавека. Кепска мужчыну стала ў аўтобусе «МАЗ», у якім — улетку — была ўключаная сістэма ацяплення. Ён яшчэ здолеў выйсці на першым-лепшым прыпынку, але ў момант прыезду «хуткай» быў ужо мёртвым.

Зразумеўшы, што гэта ўжо не пацыент, дактары з'ехалі. Прайшло некалькі гадзін, перш чым цела чалавека забралі ў морг. Гэты выпадак застаецца на сумленні гарадскіх службаў. Галоўнае, варта разабрацца, чаму ў душныя дні ў аўтобусах МАЗ людзі млеюць.

### Еўрастандарты не ўсім па плячы

МАЗы народ даўно мянуе «душагубкамі» — у гарачыню праз духату паездка ператвараецца ў пакуты. Асабліва цяжка пераносяць спёку людзі з ціскам — а гэта пераважна пенсіянеры і ветэраны, «якім усюды ў нас пашана».

«НН» пацікавілася ў галоўнага канструктара Мінскага аўтамабільнага завода Аляксандра Мышко, чаму так цяжка ездзіць у айчынных аўтобусах улетку.

Паводле ягоных словаў, аўтобусы камплектуюцца рухавікамі еўрастандарту. Адно з патрабаванняў гэтага стандарту — экалагічнасць, а гэта значыць, выпрацоўка шкодных выхлапаў зводзіцца да мінімуму. Для гэтага выхлапы дадаткова спальваюцца, і праз гэта рухавік працуе ў павышаным тэмпературным рэжыме. На аўтобусах «Ікарус» тэмпература рухавіка складала 80° С. На сучасных рухавіках — 95° С. Таму некаторым вадзіцелям падаецца, што рухавік перагрэецца. А ад перагрэву яго можа заклініць. Таму яны адкручваюць адмысловыя краны, каб гарачая вадкасць сістэмы ахаладжэння адліла ад рухавіка. Гэтая вадкасць і напальвае салон. Такім чынам, тэмпература ў салоне моцна падвышаецца. Але, як адзначыў галоўны канструктар МАЗа, калі аўтобус спраўны, няма аніякай патрэбы ўключаць ацяпленне.

Другая праблема — у фортках. Яны бываюць клапанныя і ссоўныя. Аўтобусы з клапаннымі форткамі замаўляе для сваіх аўтапаркаў «Мінсктранс». Аўтобусы з ссоўнымі курсуюць у астатніх гарадах Беларусі. У чым розніца між клапаннымі і ссоўнымі? Ссоўныя звычайна выкарыстоўваюць у краінах з гарачым кліматам — яны ствараюць скразнякі і паветраабмен, а клапанныя выкарыстоўваюць у краінах з сярэднім кліматам. Але ў еўрапейскіх краінах для гарачых дзён існуюць кандыцыянеры, пра што беларускім пасажырам застаецца пакуль толькі марыць.

Канструктар таксама адзначыў, што апошнія некалькі месяцаў «Мінсктранс» актыўна цікавіўся ссоўнымі форткамі і думаў над пытаннем іх усталявання ў мінскіх гарадскіх аўтобусах. Каб даведацца пра іх канчатковае рашэнне, мы тэлефанавалі галоўнаму інжынеру «Мінсктранса», намесніку генеральнага дырэктара Аляксандру Сахару.

### «Пасажырам прыйдзецца пацярпець»

Аляксандр Сахар адказаў, што насамрэч «Мінсктранс» абдумваў устаноўку ссоўных фортачак у сталічных аўтобусах, але яны вырашылі, што ўсё застанецца па-старому. Чаму? «Таму што, па-першае, усе аўтобусы ў Мінску такія, і замяніць форткі было б справай праблематычнай. Па-другое, клапанныя форткі больш трывалыя. Па-трэцяе, калі хадзілі аўтобусы «Ікарус» з шырокімі форткамі, пасажыры праз сваю недастатковую культуру пастаянна высоўваліся з вокнаў».

Гендырэктар «Мінсктранса» ўпэўнены, што калі зрабіць шырокія форткі і люкі, пасажыры будуць скардзіцца ўжо не на духату, а на скразнякі. Прытым Аляксандр Сахар не адмаўляе, што існуе таксама праблема адукацыі вадзіцеляў, якія адкрываюць краны, каб пазбегнуць перагрэву рухавіка. «Але і пры поўным закрыцці кранаў у гарачае надвор'е цеплыня перадаецца, награваючы рашотку і абшыўку сядзенняў, — кажа ён. — Ставіць кандыцыянеры пакуль дорага — гэта адаб'ецца і на коште паездкі таксама. Калі б былі кандыцыянеры, зноў жа былі б скаргі, што кагосьці прадзьмула. Пасажырам прыйдзецца пацярпець».

### Як абараніць свае правы?

Цярпець не варта. Каб аднойчы не апынуцца ў сітуацыі таго мужчыны, труп якога праляжаў на прыпынку некалькі гадзін. Што рабіць, калі вы заўважылі парушэнне рэжыму эксплуатацыі аўтобуса?

Перш за ўсё тэлефануйце на «гарачую лінію» Мінсктранса (017) 246-97-47. Назавіце рэгістрацыйны нумар аўтобуса, маршрутны нумар і дакладны час, калі вы сталі сведкам парушэння.

Зрэшты, пасажыр — гэта спажывец, і як спажывец мае права на камфортную паездку. У Беларускім таварыстве аховы спажыўцоў юрысты далі наступныя парады: «Калі вы адчулі высокую тэмпературу ў аўтобусе і маркуеце, што вінаваты вадзіцель, смела звяртайцеся да кіраўніцтва аўтапарка і апісвайце сваю сітуацыю. У выпадку, калі адказ кіраўніцтва вас не задаволіць, звярніцеся ў службы абароны правоў спажыўцоў ці скарыстайцеся паслугамі адваката. Існуе таксама сектар абароны правоў спажыўцоў у Мінгарвыканкаме (па адрасе пл.Свабоды,8 — кабінет 301, тэлефон 220-28-81) — там дапамогу вам акажуць цалкам бясплатна».

**Вольга Жарнасек**

ТЭЛЕПРАГРАМА НА 17—23 ЖНІЎНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

## 17 жніўня, панядзелак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 14 серыя
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**20.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20.35** Госць «Белсата»: Стэфан Эрыксан — амбасадар Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кірыла Тураўскі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Дзённікі матацыкліста», маст. фільм, рэж. Вальтэр Салес, 2004 г., Нямеччына—ЗША—Францыя—Вялікабрытанія—Мексіка—Перу—Аргентына—Чылі.
**23.20** Аб'ектыў (паўтор)

## 18 жніўня, аўторак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 8 серыя
**19.35** «Зберагчы спадчыну», рэпартаж, 2008 г., Польшча
**19.55** Побач з намі
**20.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 20 серыя
**22.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля») (паўтор)
**22.35** Аб'ектыў (паўтор)

## 19 жніўня, серада

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 9 серыя
**19.30** «Бульбаны», мультсерыял
**19.40** «Фокусная адлегласць», дак. фільм, рэж. Андрэй Куціла, 2008 г., Беларусь
**20.05** Хто ёсць кім: Лісты з лесу Паўла Севярынца
*Павал Севярынец — беларускі апазіцыйны палітык, пісьменнік, публіцыст, адзін з заснавальнікаў «Маладога фронту» і палітычны вязень. Нарадзіўся ў Оршы ў сям'і журналіста і настаўніцы. У 2000 г. скончыў геаграфічны факультэт БДУ. У 1994—1999 гг. працаваў журналістам. З 1998 г. пачаў друкавацца ў незалежнай прэсе як публіцыст. У 1995 г. Севярынец уступіў у БНФ «Адраджэнне». У лютым 1997 г. узначаліў Мінскую моладзевую фракцыю БНФ. У верасні 1997 г. на Устаноўчым сойме «Маладога фронту» быў абраны сустаршынёй арганізацыі. У 1997—2004 гг. быў арганізатарам масавых вулічных выступаў моладзі супраць палітыкі прэзідэнта Лукашэнкі. У 1999—2003 гг. — намеснік старшыні Партыі БНФ. Ад 1999 да 2004 г. — старшыня «Маладога фронту». Севярынец быў адным з арганізатараў I Кангрэсу беларускае моладзі (ліпень 2001 г.), абароны Курапатаў (верасень 2001 — чэрвень 2002 г.), нацыянальнай кампаніі «Беларусь у Еўропу!» (вясна 2002 г.), перадвыбарчага блоку «Маладая Беларусь» (2004). У 2005 г. Паўла абвінавацілі ў арганізацыі акцый пратэсту супраць перавыбрання Лукашэнкі на трэці тэрмін, што адбываліся ў Мінску пасля рэферэндуму 2004 г. Яго асудзілі на 3 гады абмежавання волі. Пакаранне адбываў на лесанарыхтоўках у в. Малое Сітна Полацкага раёна. У 2006 г. міжнародная арганізацыя «Amnesty International» прызнала Паўла Севярынца вязнем сумлення. З улікам амністыі тэрмін зняволення скарацілі да двух гадоў і ў 2007 г. Севярынца вызвалілі.*
**20.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Ямы», маст. фільм, рэж. Эндру Дэйвіс, 2003 г., ЗША.
**23.05** Аб'ектыў

## 20 жніўня, чацвер

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 10 серыя
**19.35** «Бульбаны», мультсерыял
**19.45** «Дарога на Вільню», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Курапаты — шлях сумлення», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**21.55** Форум (ток-шоу): «Ці лёгка быць маладым?»
**22.40** Аб'ектыў

## 21 жніўня, пятніца

**19.00** Аб'ектыў
**19.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Плошча», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь
**20.40** Госць «Белсата»
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Плямёны» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Бандыт», драма, рэж. Мацей Дэйчэр, 1997 г., Польшча—Вялікая Брытанія—Францыя—Нямеччына. У галоўнай ролі Тыль Швайгер.
**22.45** Аб'ектыў

## 22 жніўня, субота

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.10** МакраФон: «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі — Луцк-2007, ч. 3: выступ гуртоў «Зніч» і «Тав. Маўзер»
**19.45** Чалавек-эпоха: «Кароль Уга», дак. фільм, рэж. Франка дэ Пэна (Franco de Pena), 2007 г., Польшча
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**21.40** «Дэтэрмінатар», серыял: 7 серыя




**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22.50** Аб'ектыў

## 23 жніўня, нядзеля

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 15 серыя
**20.05** МакраФон: «Minsk-Mixt—2008», ч. 3: канцэрт гурту «Dali»
**20.20** «Атамны полк», дак. фільм, рэж. Зоя Катовіч, 2008 г, Беларусь
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: «Цёмна-сіні, амаль чорны», маст. фільм, рэж. Даньель Санчэс Арэвалё, 2006 г., Іспанія.
*Цёмна-сіні, амаль чорны — стан душы, няпэўная будучыня, колер. Колер, якога мы часам не распазнаем, які змяняецца ў залежнасці ад асвятлення, пункту гледжання і стаўлення. Колер, які нагадвае, што часам мы памыляемся, а рэчы не заўжды такія, якімі здаюцца.*




**Вы будзеце смяяцца, але Мінск ізноў заліло. 6 жніўня сталіцу накрыла чарговая залева. Калі так пойдзе далей, налета можна будзе купляць маторкі замест аўто.**



**Літоўка заваявала тытул «Місіс Сусвет — 2009».**

Вайда Рагенайтэ стала пераможцай конкурсу «Mrs Universe — 2009», фінал якога прайшоў у нядзелю ў Рызе і сабраў 20 удзельніц.

Вайда Рагенайтэ — спецыяліст па фінансах. Яна выхоўвае двaіх дзяцей: 15-гадовага сына і двухгадовую дачку.

**delfi.lt**




**9 жніўня Мінскі заапарк адзначыў 25-годдзе. З гэтай нагоды ў заапарку прайшло свята. Выступілі спевакі Хлястовы, а таксама казацкі ансамбль (хто не ведае — казакі заапарк ахоўваюць).**

## АНЕКДОТЫ

* * *

— Ты чуў? У нас збіраюцца будаваць платныя аўтадарогі. Яны будуць у два разы таннейшыя за бясплатныя.
— Гэта як?
— На платных дарогах не будзе ДАІ.

* * *

— У нас дачка танцуе і спявае. Думаем, кім будзе — спявачкай ці танцоркай?
— Хутчэй, танцоркай.
— Вы бачылі, як яна танцуе?
— Не, чула, як яна пяе.

* * *

Курортнік спрабуе знязць пакой ля мора.
— А дзе тут у вас зручнасці? — пытаецца ён у гаспадара.
Гаспадар (сарамліва):
— На двары.
— А дзе тут у вас двор?
Гаспадар (сарамліва):
— Праз вуліцу.
— А вуліца дзе?!
Гаспадар (сарамліва):
— Уніз па завулку, там спытайце.

# Парасячы Майдан

**ЛЕВЫМ ВОКАМ**



**Мэты абвешчанай А.Лукашэнкам у Ляхавіцкім раёне рэвалюцыі ў свінагадоўлі тыя ж, што і ў «аранжавай» — праз два гады «жыць, як у Еўропе». Фельетон Лёліка Ушкіна.**

Люты 2014 года. Расія. Дзень выбараў прэзідэнта. Штаб дэмакратычнай апазіцыі. Усе прысутныя тупа глядзяць ў целек.

**Дыктар на экране:** Паводле афіцыйных дадзеных ЦВК, Дзмітрый Мядзведзеў набраў 74% галасоў, Жырыноўскі — 12%, Зюганаў — 6%, Багдан Ісакавіч Саакабідзэ-Дудаеў (незалежны кандыдат) — 4%, Анатоль Каспараў (дэмакратычная апазіцыя) — 1,5%.

**Усе прысутныя:** Колькі-колькі?

**Дыктар:** Прабачце. Адбылася памылка. У кандыдата ад дэмакратаў 0,04% галасоў. А зараз — рэклама сродку для чысткі ўнітазаў «Даместас».

Маўчанне.

**Касьянаў:** У каго ёсць канспект?

**Лімонаў:** Які канспект?

**Касьянаў:** Канспект лекцый па арганізацыі свінячых рэвалюцый. Памятаеш семінар у Мінску ў 2012-м «Парасячая рэвалюцыя як новае слова ў практыцы аранжавай рэвалюцыі»? Ну, іх чытаў у лагеры на базе КДБ такі высокі качок. Як яго — Ян Усеваладоўскі...

**Лімонаў:** Ды я большасць лекцый прагуляў. Гэтак хацелася пабачыць беларусаў, якія сталі жыць, як у Еўропе...

**Каспараў:** У мяне ўсе хады запісаныя! Зараз пагляджу. Лекцыя «Кармленне свінаматак». Гэта не тое. Семінар «Купанне нараджаных парасят». Не тое. Ага, вось: «Будаўніцтва свінакомплексу на 50 тысяч галоў». Менавіта з такога «пілота», як запісана ў канспекце, пачалася ў Беларусі рэвалюцыя ў свінагадоўлі. Дзякуючы ёй, дарэчы, беларусы жывуць цяпер у Еўропе, а мы дасюль пакутуем пад прыгнётам «крывавай гэбні».

**Лімонаў:** Кажаце, свінакомплекс? А ён вытрымае DOS атаку?

**Каспараў:** Дакладчык казаў, што мае вытрымаць.

**Лімонаў:** Тады наперад! Няхай жыве расійская дэмакратыя!

Дэмакраты высыпалі на вуліцу. Іх адразу падтрымаў просты расійскі люд, які ўжо стаміўся ад тандэму Пуціна—Мядзведзева. На Чырвонай плошчы натоўпам быў стыхійна пабудаваны па дацкіх і галандскіх тэхналогіях свінакомплекс на 50 тысяч галоў. Парсюкоў кармілі ўсім светам. Гурты «ДДТ» і «Ленінград» давалі для іх бясплатныя канцэрты. Заходнія дэмакратычныя палітыкі прыязджалі выказаць захапленне падзеямі.

Хутка такія свінакомплексы выраслі і ў іншых гарадах Расіі. Крамлёўская адміністрацыя не ведала, што рабіць з усенародным рухам дэмакратычнай свінагадоўлі. У выніку пуцінскі клан пагадзіўся пайсці на перамовы з апазіцыяй. Вынікі выбараў пералічылі. Як аказалася, гэта не Мядзведзеў, а Каспараў набраў 74% галасоў. У Расію прыйшла дэмакратыя. Аднак Еўропай чамусьці не пахла.

Дэмакраты зноў палезлі ў канспект лекцый і з жахам зразумелі сваю канцэптуальную памылку. Яны прапусцілі важны абзац, прысвечаны ролі ў рэвалюцыйным працэсе саломы. А між тым галоўны тэарэтык беларускай праеўрапейскай рэвалюцыі ясна сказаў: «Растрасіце яе, потым дадайце калій або азот. Калі зараз мы дадамо гэта ўгнаенне, у нас будуць развязаныя рукі ўвесну».

Дэмакраты схапіліся за галаву, аднак рабіць нешта было позна. Расія ўпусціла ўнікальны шанец вярнуцца ў Еўропу. Хутка краіна зноў трапіла пад кантроль рэжыму кіраванай дэмакратыі.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**ВІТАННІ**

**Віншуем Маргарыту і Яраслава Сцешыкаў** з нараджэннем цудоўнай дачушкі Нікі. Няхай расце пераможцай. Сябры

**ЖЫТЛО**

**Прыемная і спакойная маладая пара** тэрмінова здыме аднапакаёвую кватэру на доўгі час у пасёлку Бараўляны або ў мінскіх раёнах Зялёны Луг і Усход. Разгледзім любыя прапановы. Т.: (029) 640-75-01, (029) 857-73-17, Дзяніс

**Пісьменнік (сталага веку)** здыме аднапакаёвую кватэру па лініі метро. Т. (029) 771-49-39, (044) 788-63-84, (017) 288-63-84

**ДОМ**

**Набуду хутар, дом,** зямельны ўчастак у Мінскім раёне, вобласці. Для сябе. Т.: (029) 682-32-18

**ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ТРУСЯНЯТЫ**

**Прадаем** маленькіх дэкаратыўных трусянят. Т.: (029) 577-78-07, (029) 677-29-34

**ЗАПРАШАЮ ГРАФІТЫСТАЎ**

**Запрашаю свабодных мастакоў** і графітыстаў для роспісу аграсядзібы. Т.: (029) 941-50-81 (Валеры).

**ПАЕЗДКА**

**Арганізуецца паездка на фестываль «Be Free»** у Чарнігаве 22—23 жніўня. Выезд 21-га ўвечары (пятніца), прыезд 24 (панядзелак) зранку. Т.: (029) 622-57-20, (029) 509-12-16

**ШЛЯХЕЦТВА, РЫЦАРСТВА**

**Афармленне** рыцарскіх грамат, відэаматэрыял. Рыцарскія фестывалі, раскопкі палаца Радзівілаў, гіст. літаратура, калекцыянаванне. alesknigi@mail.ru

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Пінск.** Арыштавалі хеўру, што займалася вызваленнем ад набору ў салдаты. У гэтай хеўры папаўся былы станавы і паліцэйскі чыноўнік.

**«Наша Ніва». №30. 1909**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6050. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 11.08.2009.
Замова № 4354.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 09030